НАВАГОДНІЯ ПРЫГОДЫ ДЗЕДА МАРОЗА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

16 СНЕЖНЯ 2021 г. ЧАЦВЕР № 243 (29612)

ЧАМУ Ў ЛІТВЕ РАЗГАРНУЎСЯ ПАЛІТЫЧНЫ КРЫЗІС? 13

КАРАТКА

• У Беларусі да 2025 года пабудуюць каля 800 станцый абезжалезвання.

• **Чырвоны Крыж у Гродне запрашае «чараўнікоў» рэгіёна здзейсніць мары дзяцей на «Ёлцы жаданняў».**

• Больш за 30 маладзёжных праектаў прадставяць на абласным этапе «100 ідэй для Беларусі» ў Гродне.

• **У Мінску запалілі агеньчыкі навагодніх ёлак і ўключылі святочную ілюмінацыю.**

• Выстава анёлаў і майстар-клас па стварэнні ўпрыгожванняў да Каляд пройдзе ў БДУ.

ЦЫТАТА ДНЯ

Уладзімір ПАЗНЯКОЎ, намеснік старшыні Федэрацыі прафсаюзаў:

«Цяпер мы бяром на кантроль тыя пазіцыі, якія выключаны з пастановы нумар 100 «Аб часовых мерах па стабілізацыі цэн на сацыяльна значныя тавары першай неабходнасці». Сёння ўжо ёсць дамоўленасць з Камітэтам дзяржкантролю, МАРГ, што мы сумесна, практычна ўручную, будзем адсочваць, каб не было неабгрунтаванага росту цэн. Пры неабходнасці будзем інфармаваць Міністэрства гандлю і антыманапольнага рэгулявання, урад у цэлым, бо менавіта яны з'яўляюцца рэгулятарамі ў гэтай сферы».

ISSN 1990 — 763X

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«Людзі павінны паверыць, што вы не толькі бачыце шляхі развіцця, але і здольныя іх рэалізаваць»

Аб чым гаварыў Прэзідэнт, прадстаўляючы актыву Віцебшчыны новага губернатара

У Віцебскім аблвыканкаме кіраўнік краіны прадставіў новага кіраўніка вобласці Аляксандра Субоціна. Падчас амаль трохгадзіннай размовы Прэзідэнт расказаў пра асаблівасці сучаснага геапалітычнага светапарадку, будучыя змены ў Канстытуцыю, абазначыў пункты росту рэгіёна і слабыя бакі, якімі неабходна заняцца новаму кіраўніку Віцебшчыны.

Фота БелТА.

Пра «сацыялку» і бяспеку

Для сустрэчы з актывамі абласцей Аляксандр Лукашэнка абраў нетыповую форму размовы. Прэзідэнт незапланавана выклікаў да трыбуны спецыялістаў, якія кіруюць пэўнымі сферамі ў рэгіёне.

Пачалі ўчора з «сацыялкі», асаблівую ўвагу ўдзялілі ахове здароўя і сітуацыі з ковідам у вобласці. Дакладваў па сітуацыі з захваральнасцю на ковід у вобласці намеснік старшыні аблвыканкама Уладзімір Пенін. «На сённяшні момант у нас эпідэмія ідзе на змяншэнне. Што датычыцца Віцебска, чатыры бальніцы прымаюць хворых на ковід. Сёння ў нас хварэе менш чым 1000 чалавек. Гэта 25 працэнтаў ад піка», — сказаў намеснік губернатара.

У барацьбе з эпідэміяй ковіду, па яго словах, дапамагалі і выкладчыкі, і студэнты абласнога медыцынскага ўніверсітэта. 43 % жыхароў рэгіёна ўжо прышчэплена першым кампанентам супрацьковіднай вакцыны, да канца года мяркуюць выйсці на лічбу ў 50 %.

СТАР. 2

Свая справа

САМ-НАСАМ З НЕБАМ... І ЗЯМЛЁЙ

Як парашутыст-дэсантнік узяў кавалак зямлі на Маларытчыне і стаў фермерам

Пётр ЗВАРЫЧ чвэрць стагоддзя праслужыў у 38-й дэсантна-штурмавой брыгадзе. Па роду службы ён, спартсмен-парашутыст, рыхтаваў маладых салдат да першага скачка. У самога ж гэтых скачкоў — 960. Ён па-ранейшаму лічыць самым лепшым, ні з чым не параўнальным уражаннем адчуванне палёту, тыя секунды, пакуль яшчэ не раскрыты парашут, і ты лунаеш у паветры сам-насам з небам. Некаторыя называюць такія імгненні найвышэйшай асалодай. Адрэналін яшчэ звязаны з рызыкай, бо чакаеш, ці спрацуе парашут. Вось ён раскрыўся — зноў ляціш і зноў непаўторныя адчуванні, а перад зямлёй ахоплівае новы неспакой, каб не зачапіць правады, будынкі, дрэвы, каб добра прызямліцца... Ну і навучыць гэтаму іншых — таксама асаблівае задавальненне.

Цяпліца з саджанцамі.

СТАР. 15

У цэнтры ўвагі

БУДУЧЫНЯ БЕЛАРУСКАЙ ШКОЛЫ

«Канцэпцыя развіцця сістэмы адукацыі да 2030 года прадугледжвае пашырэнне варыятыўнасці зместу агульнай сярэдняй адукацыі», — пра гэта падчас спецпраекта ў БелТА паведаміла дырэктар Нацыянальнага інстытута адукацыі (НІА), кандыдат педагагічных навук Валянціна ГІНЧУК.

НЕЗАЛЕЖНЫ ЭКЗАМЕН

У прыватнасці, вучонымі-педагогамі распрацоўваецца новая структура тыпавога вучэбнага плана агульнай сярэдняй адукацыі, які прадугледжвае выдзяленне абавязковых для вывучэння прадметаў і прадметаў, якія вывучаюцца па выбары навучэнцаў.

СТАР. 4

Кожны дзень – са «Звяздой»!

Усім, хто падпісаўся на I квартал або I паўгоддзе 2022 года, — у падарунак чатыры календары — маляўнічы насценны, рэлігійны, народны і месяцавы

«Людзі павінны паверыць, што вы не толькі бачыце шляхі развіцця, але і здольныя іх рэалізаваць»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Прэзідэнт пацікавіўся, якая сітуацыя з кадрамі ў сферы сацыяльнага абслугоўвання: «Мы заўсёды кажам, што ў нас праблема з кадрамі, заробкамі. У вас, што, няма гэтых праблем?» «Заробак усім хочацца большы. Таму гэта праблема ёсць. Але ў той жа час сказаць, што гэта адна з галоўных праблем — я так не сказаў бы», — адказаў намеснік старшыні аблвыканкама.

Гаворачы аб сферы культуры, Аляксандр Лукашэнка пацікавіўся, якія заробкі ў работнікаў гэтай галіны. Як далажылі Прэзідэнту, самыя нізкія ў бібліятэках, школах мастацтваў. У адказ атрымалі заданне — заняцца гэтай праблемай, асабліва паглядзець на магчымасць перафарматавання работы бібліятэк.

«Трэба даць дакладныя арыенціры, як тут рабіць. Гэтым пытаннем трэба займацца сур'ёзна. Я разумею, што тут і ўрад павінен даць арыенцір. А можа, нават і прыняць нейкае рашэнне, выпрацаваць сістэму», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

Найбольшую занепакоенасць у вобласці выклікае недахоп грошай для паляпшэння матэрыяльна-тэхнічнага аснашчэння медустаноў. Асабліва ў абласной бальніцы, яе Уладзімір Пенін назваў адной з самых горшых сярод падобных устаноў у іншых рэгіёнах. Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што для яго гэта было непрыемным адкрыццём, і паабяцаў дапамогу. «Лішніх грошай няма, але гэта галоўнае. Лячыць людзей трэба», — дадаў Прэзідэнт.

Начальнік галоўнага ўпраўлення па ахове здароўя Міхаіл Вішнявецкі працягнуў тэму ковіду. Прэзідэнт пацікавіўся амбулаторным лячэннем хворых, шпіталізацыяй ковідпацыентаў, рэабілітацыяй вылечаных. Прэзідэнт настойвае: у лячэнні немалаважную ролю іграюць рэгулярнае праветрыванне палат, прагулкі на свежым паветры.

Сярод праблем медгаліны вобласці спецыяліст назваў замацаванне медыцынскіх кадраў на месцах. Прэзідэнт яшчэ раз нагадаў пра адміністрацыйныя метады: ***«Паглядзець, напэўна, трэба па адпрацоўцы. Урача рыхтуем, гэта нам нятанна абыходзіцца, а ён развярнуўся і з'ехаў. Абавязкова адпрацоўка. У наш час проста трымаць, утрымаць, не пускаць цяжка. Калі цябе дзяржава падрыхтавала, а ты вырашыў кудысьці пераехаць ці з'ехаць, адпрацуй ці заплаці і едзь. Тады падумаюць тысячу разоў».***

Наступная тэма — барацьба са злачыннасцю, забеспячэнне заканадаўства. Пракурор вобласці Іван Украінец адзначыў стабілізацыю крымінагеннай абстаноўкі, зніжэнне злачыннасці. Разам з тым ёсць рост цяжкіх і асабліва цяжкіх злачынстваў, звязаных з незаконным абаротам наркатычных сродкаў.

У цэлым пракурор вобласці канстатаваў, што паміж праваахоўнымі службамі наладжана цеснае ўзаемадзеянне, праводзяцца прафілактычныя мерапрыемствы, сур'ёзная работа па процідзеянні карупцыі.

Аддача павінна адпавядаць укладзеным рэсурсам

Прэзідэнт сказаў, што Віцебшчына заўсёды была і застаецца калыскай духоўнасці нашага народа. «Тысячагоддзе таму тут нараджаліся вытокі нашай дзяржаўнасці, — заўважыў Прэзідэнт. — А сёння Віцебск — фактычна культурная сталіца Беларусі. Я ўжо не кажу пра тую прыродную прыгажосць, якой славіцца наша Віцебшчына».

Але, па словах кіраўніка краіны, ёсць шмат «момантаў», якія насцярожваюць у рэгіёне, таму падставы расслабляцца няма, і не толькі праваахоўным органам.

«Нельга расслабляцца. І не толькі праваахоўнікам, яны задзейнічаны на ўсю моц. Дзяржслужачыя павінны страпянуцца. І самае галоўнае — трэба працаваць з насельніцтвам!» — дадаў кіраўнік краіны.

Прэзідэнт папрасіў чыноўнікаў знаходзіць час асабіста прымаць людзей і займацца іх праблемамі. Ён расказаў, як раніцай, пакуль знаходзіўся ў сваёй роднай вёсцы, да яго дамоў прыйшлі дзве пенсіянеркі з-пад Оршы. Яны прасілі дапамагчы з вырашэннем зямельна-маёмасных пытанняў. Не адмаўляцца ад асабістых прыёмаў грамадзян і ўважліва ставіцца да насельніцтва з рэгіёнаў заклікае Аляксандр Лукашэнка і актыў Віцебскай вобласці.

«Гэтыя пенсіянеркі, бедныя, вымушаны хадзіць па краіне. Гэта недапушчальна. Я памятаю, адкуль я сам. Не забывайце і вы, адкуль і куды вернемся», — заявіў кіраўнік краіны.

Ён папрасіў адказна ставіцца да яго загадаў, бо яны прымаюцца на нарадах з шырокім колам спецыялістаў. «Ад гэтага актыву залежыць, якой у нас будзе краіна. Я ***не хачу, каб вы мяне баранілі. Вы выконвайце свае функцыі. Ажыццяўляйце паўнамоцтвы, нават калі разгорнута санкцыйная вайна. Я чакаю аддачы, як бы ні было цяжка»,*** — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

І заўважыў, што ў санкцыйнай сітуацыі неабходна не толькі знайсці выйсце з праблемы, але і магчымасці рухацца наперад. «Гэта маё жорсткае патрабаванне. Вычляняйце болевыя пытанні на Віцебшчыне і вырашайце. Не будзеце вырашаць, да мяне і ва ўрад не хадзіце. Мы вас больш падтрымліваць не будзем. Такіх велізарных рэсурсаў, якія былі накіраваны ў Віцебскую вобласць ад вёскі да нафтаперааапрацоўкі, не накіроўвалі ні ў адну вобласць. Я чакаю ад вас аддачы, як бы цяжка ні было», — сказаў кіраўнік краіны, дадаўшы, што ціск на Беларусь ідзе з мэтай змяніць уладу і дзяржаўны лад.

«Мы гатовы змяняцца да лепшага, але рабіць гэта трэба цывілізавана», — сцвярджае Прэзідэнт. І адзначае: міма нас не праходзіла ніводная вайна ў мінулым, і ў надзвычайным выпадку так будзе і ў сучаснасці. «Таму ***мая задача — захаваць дзяржаву і народ ад вайны. Ад вас патрабую маналітнасці і яднання. Трэба дзейнічаць, не разлічваючы ні на кога»,*** — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

«Рэгіёну патрэбна перазагрузка»

Значныя сродкі для мадэрнізацыі выдзелены нафтахімічнай прамысловасці, беспрэцэдэнтныя льготы і прэферэнцыі для Аршанскага раёна сталі прыкладам для краіны, асаблівыя ўмовы работы мае аграпрамысловы комплекс у рамках інтэграцыйных структур. Створана эканамічная зона «Брэміна-Орша» ў Балбасаве, пералічыў дасягненні Віцебшчыны кіраўнік краіны.

І гэта толькі некаторыя прыклады.

Многія з дадзеных праектаў былі асабіста ініцыіраваныя былым губернатарам Мікалаем Шарснёвым. Як акцэнтаваў Прэзідэнт, гэта характарызуе яго як чалавека неабыякавага, які перажывае за справу. А тое, што па некаторых з праектаў ёсць праблемы ў рэалізацыі, пытанне не толькі да кіраўніка вобласці, але і ўрада.

«Дзеля справядлівасці ёсць прыклады дасягнення прыстойных вынікаў асобнымі прамысловымі і сельскагаспадарчымі прадпрыемствамі. Ды і нельга не адзначыць добрым словам усё, што было зроблена ў сферы культурнага развіцця рэгіёна, удасканалення інфраструктуры. Як Віцебшчына ўпрыгожваецца і наколькі стала больш парадку на зямлі, добра відаць з верталёта», — сказаў Аляксандр Лукашэнка і падзякаваў за працу Мікалаю Шарснёву. Ён адзначыў, што кампетэнцыі былога губернатара спатрэбяцца на новай пасадзе.

Разам з тым хваліцца вобласці, шчыра заўважыў Прэзідэнт, асабліва няма чым. За апошнія сем гадоў валавы рэгіянальны прадукт скараціўся больш чым на восем працэнтаў. У бягучым годзе рэгіён адзіны, дзе прадаўжае зніжацца ВРП, у асноўным за кошт будаўніцтва і сельскай гаспадаркі.

«Відавочна, што рэгіёну патрэбна перазагрузка, калі хочаце — сур'ёзнае ўзрушэнне. Таму мной прынята рашэнне аб прызначэнні на Віцебшчыну маладога перспектыўнага кіраўніка, для якога ваш край з'яўляецца роднай зямлёй, Аляксандра Міхайлавіча Субоціна», — патлумачыў выбар кіраўнік краіны.

Як паведаміў Аляксандр Лукашэнка, новы губернатар непасрэдна прымаў удзел у распрацоўцы падыходаў да развіцця аграпрамысловага комплексу, стварэння аб'яднанняў. У пэўнай ступені з'яўляецца іх сааўтарам і разумее, як усё павінна быць рэалізавана на практыцы.

«Перш за ўсё неабходна самая строгая тэхналагічная і выканальніцкая дысцыпліна, эканомія ўсіх рэсурсаў. Новы губернатар як чалавек навукі, думаю, гэта цудоўна разумее», — адзначыў Прэзідэнт.

Акрамя таго, Прэзідэнт папрасіў прыгледзецца да кадраў. Толькі за апошнія пяць гадоў тройчы змяняліся кіраўнікі ў Шумілінскім і Аршанскім райвыканкамах, двойчы — у Браслаўскім, Талачынскім, Дубровенскім і Бешанковіцкім.

«Вам трэба будзе разабрацца ў прычынах такой сітуацыі, знайсці рашэнні і выбудаваць дакладную кадравую вертыкаль Віцебскай вобласці. Адсутнасць сістэмнасці ў рабоце з кадрамі ў рэгіёне недапушчальная», — звярнуўся да новага губернатара Аляксандр Лукашэнка.

Асобнае пытанне на сустрэчы з актывам — стагнацыя прамысловага комплексу вобласці. Вынікі застаюцца залежнымі ад двух прадпрыемстваў — «Нафтана» і «Віцебскэнерга». «Відавочна, што без новых пунктаў росту праблемы не вырашыць. У Віцебшчыны ёсць свае ўнікальныя перавагі, якія недавыкарыстаны. А значыць, павінны, але не даюць патрэбнай фінансавай аддачы. Гэта багатыя водныя і лясныя рэсурсы, вышокія плошчы прыродаахоўных тэрыторый, значныя мінеральна-сыравінныя запасы — гліністай сыравіны, даламіту, торфу, сапрапеляў. Яны маюць патрэбу ў распрацоўцы, і запыт на іх ёсць», — паставіў задачу Прэзідэнт.

На сустрэчы ён нагадаў: задачы па рэалізацыі аднаго буйнога інвестыцыйнага праекта пастаўлены ў кожнай вобласці. «Я думаю, Аляксандр Міхайлавіч свой праект прыдумае і створыць. І, вядома, завяршыць ужо пачатыя праекты трэба, якія «прабуксоўваюць» і адцягваюць на сябе народныя сродкі. Усе яны павінны запрацаваць на поўную магутнасць і даць людзям годны кавалак хлеба, а дзяржаве — прыбытак», — заявіў кіраўнік краіны.

Сярод такіх праектаў — мясакамбінат і льнокамбінат у Оршы, Мёрскі металапракатны завод і многія іншыя. Прэзідэнт нагадаў аб сваіх планах пабываць у Мёрах асабіста і дэталёва азнаёміцца з работай новага завода.

На поўную магутнасць павінен запрацаваць і мультымадальны прамыслова-лагістычны комплекс у Балбасаве, пра які так шмат гаварылася.

Заслужыць у людзей давер

Сітуацыя ў рэальным сектары абласной эканомікі адмоўна адбіваецца на дабрабыце грамадзян, заўважыў Прэзідэнт.

«Нядзіўна, што такія ўмовы непрывабныя для насельніцтва рэгіёна. Задача новаму губернатару — узняць давер жыхароў да абласной улады. ***Людзі павінны паверыць, што вы не толькі бачыце шляхі развіцця, але і здольныя іх рэалізаваць»,*** — дадаў Прэзідэнт.

Кіраўнік краіны мяркуе, што без гэтага даверу цяжка будзе вырашыць і палітычны блок пытанняў, які стаіць на парадку дня. У тым ліку і рэферэндум.

Калі народ Беларусі на рэферэндуме падтрымае праект абноўленай Канстытуцыі, то за гэтым прыйдзе час вялікай і адказнай работы. «Важна, што будзе потым. ***Нам давядзецца пералапаціць сотні нарматыўна-прававых актаў. Трэба выбудаваць краіну ў цэлым. Не толькі ў плане нарматыўна-прававой культуры, але трэба будзе арганізацыйна дзе-нідзе па-новаму выбудаваць краіну. Гэта мая найважнейшая задача як Прэзідэнта. За мяне ніхто гэтыя пытанні не вырашыць. Я павінен арганізаваць гэтую работу разам з урадам, губернатарамі, старшынямі гар- і райвыканкамаў, разам з вамі — актывам. Для таго каб краіна стабільна стаяла на тых апорах, на якіх павінна стаяць»,*** — заявіў кіраўнік дзяржавы.

Напрыканцы сустрэчы Прэзідэнт уручыў службовае пасведчанне Аляксандру Субоціну і заўважыў: «Вы жывяце тут, вы соль нашай зямлі. ***Трымайце краіну. Будзе Лукашэнка — не будзе — гэта ваша краіна. Мы з вамі яе выпеставалі за чвэрць стагоддзя і нікому не павінны аддаць».***

Марыя ДАДАЛКА,
г. Віцебск.

«АСАБЛІВЫ СТЫЛЬ КІРАЎНІЦТВА»

Як і ў Магілёве, пасля назначэння Прэзідэнтам новага кіраўніка зацвердзіць яго павінны і члены абласнога Савета дэпутатаў на пазачарговай сесіі. Да рэгіянальнай дэпутацкай супольнасці далучыліся кіраўнікі падраздзяленняў аблвыканкама, старшыні гарадскіх, раённых Саветаў дэпутатаў і райвыканкамаў, кіраўнікі прадпрыемстваў АПК, будаўнічай галіны, прамысловасці, парламентарыі, рэктары.

Прадставіў Аляксандра Субоціна актыву Віцебскай вобласці кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Ігар Сергеенка. Аляксандр Міхайлавіч вяртаецца на кіруючую пасаду ў родны рэгіён, дзе пачынаўся яго працоўны і навуковы шлях з Віцебскай акадэміі ветэрынарнай медыцыны. Займаў ён пасля пасаду і ў Адміністрацыі Прэзідэнта, намесніка міністра сельскай гаспадаркі, памочніка Прэзідэнта па Віцебскай, Магілёўскай абласцях, адстойваў інтарэсы Беларусі ў якасці члена калегіі ЕЭК. З 2020 года на пасадзе намесніка прэм'ер-міністра Аляксандр Субоцін курыраваў пытанні АПК.

Як адзначыў кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта, новы губернатар — вопытны, высокакваліфікаваны кіраўнік, спецыяліст у сельскай гаспадарцы, аўтарытэтны прафесіянал, які мае міжнародныя кантакты ў галіне сельскай гаспадаркі.

«Яго стыль кіраўніцтва вызначаецца адсутнасцю валакіты і фармалізму. Нельга казаць, што, сышоўшы з Віцебскай вобласці, Аляксандр Міхайлавіч адышоў ад праблем рэгіёна. Ён непасрэдна прымаў удзел у распрацоўцы праграм па развіцці сяла Віцебшчыны і краіны, каардынаваў распрацоўку праграм сацыяльна-эканамічнага развіцця Аршанскага рэгіёна», — сказаў Ігар Сергеенка.

За Аляксандра Субоціна паручыўся былы калега Мікалай Гаўрычэнка, рэктар Віцебскай дзяржаўнай акадэміі ветэрынарнай медыцыны. Іна Галубкова, дэпутат абласнога Савета дэпутатаў, адзначыла, што былы віцэ-прэм'ер добра ведае праблемы глыбінкі, займаючыся пытаннямі сельскай гаспадаркі, удзяляе ўвагу і сацыяльнай сферы. Алег Жынгель, член Савета Рэспублікі, падкрэсліў, што Аляксандр Субоцін ужо шмат зрабіў для развіцця рэальнага сектара эканомікі Віцебшчыны, вырашэння праблем сяла: папоўнілася матэрыяльна-тэхнічная база АПК, адрамантаваны многія жывёлагадоўчыя аб'екты, рэалізоўваюцца маштабныя інвестыцыйныя праекты.

Пасля зацвярджэння новы старшыня Віцебскага аблвыканкама адзначыў, што многія віцябчане яго ўжо ведаюць па рабоце ў рэгіёне і паабяцаў не падвесці.

«МЫ НЕ ВАРВАРЫ, КАБ ГНАЦЬ ЛЮДЗЕЙ ТУДЫ, ДЗЕ ІМ ПАГРАЖАЕ СМЕРЦЬ»

У адрозненне ад галаслоўных еўрапейскіх палітыкаў, беларускі бок робіць для бежанцаў усё магчымае. Такое меркаванне выказаў член Савета Рэспублікі Ігар ГЕДЗІЧ, перадае карэспандэнт БелТА. Цяпер бежанцы знаходзяцца ў пункце размяшчэння ў транспартна-лагістычным цэнтры «Брузгі» недалёка ад беларуска-польскай граніцы. Тут іх каля 800 чалавек, 40 працэнтаў з якіх — жанчыны і дзеці.

«Уся работа арганізавана ў штатным рэжыме», — расказаў Ігар Гедзіч. Бежанцы забяспечаны гарачым харчаваннем, неабходнымі рэчамі, арганізавана для іх і палявая лазня. Кругласутачна ў ТЛЦ дзяжураць медыкі. За суткі фіксуецца да 100 зваротаў па кансультацыйную і іншую дапамогу. У бальніцах Гродна прадаўжаюць знаходзіцца пяцёра дзяцей (трое з іх нованароджаныя) і шасцёра дарослых. «Зрэшты, людзі ішлі сюды з пэўнымі жаданнямі, таму яны пакуль не сутракаюць надзеі дабіцца сваёй мэты, апынуцца ў Еўропе», — адзначыў Ігар Гедзіч.

«Вайна не заканчвалася»

«Мы не жадаем вяртацца. Чаму? У мяне, напрыклад, нічога не засталося на радзіме. Ды і ў цэлым там вайна фактычна не заканчвалася, забіваюць людзей, на вуліцах небяспечна. А работы і грошай няма. Мне 31 год, але я не пакідаю надзеі, што буду нармальна працаваць і дастойна жыць. Таму мы і хочам патрапіць у Германію», — сказаў карэспандэнту БелТА бежанец Дана з Ірака. Ён дадаў, што беларускі бок забяспечвае бежанцаў усім неабходным. Але знаходзіцца ў чаканні вырашэння пытання многім з іх няпроста.

З тэхнічнай місіяй у ТЛЦ працавалі прадстаўнікі Міжнароднай арганізацыі па міграцыі. Яны прапанавалі бежанцам адправіцца дадому па праграме МАМ па добраахвотным вяртанні на радзіму і рэінтэграцыі. Адпаведныя заяўкі запоўніла каля 120 чалавек, паведаміла БелТА. Каардынатар па пытаннях камунікацыі Міжнароднай арганізацыі па міграцыі Вольга Барзянкова адзначыла, што праграма прадугледжвае розную дапамогу. У тым ліку ў падрыхтоўцы дакументаў, суправаджэнні людзей да аэрапорта, а пры вяртанні на радзіму ім арганізуюць трансфер да канцавога маршруту. «Таксама аказваем ім невялікую фінансавую падтрымку. Выдаюцца кішэнныя грошы на час паездкі, а для найбольш уразлівых катэгорый аказваецца падтрымка для паспяховай рэінтэграцыі на радзіме, напрыклад, падтрымка бізнесу або бізнес-ідэі, закупка абсталявання», — адзначыла яна.

«Вярнуцца дамоў яны змогуць на працягу двух-трох, максімум чатырох дзён. На мінулым тыдні мы вярнулі 25 чалавек. Літаральна на трэці дзень для іх быў арганізаваны пералёт. Тыя, хто сёння запісаўся на праграму, ужо заўтра змогуць паехаць у Мінск, а далей мы з імі будзем працаваць і падбіраць пералёты», — распавёў старшы каардынатар па пытаннях надзвычайных сітуацый Міжнароднай арганізацыі па міграцыі Махамед Рэфаат. Большасць з тых, хто ўчора запоўніў заяўкі, — грамадзяне Ірака, а таксама ёсць і жыхары Ірана.

Ганьба Дуды

Саюз маладых сацыялістаў і сацыялістак Сацыял-дэмакратычнай партыі Германіі (Jusos) выступіў за тое, каб краіна неадкладна прыняла бежанцаў, якія цяпер утрымліваюцца на беларуска-польскай граніцы. Аб гэтым паведамляе нямецкае выданне Der Spiegel. Рабочая група па пытаннях міграцыі і Jusos патрабуюць ад новага федэральнага ўрада прыняць у Германіі бежанцаў з беларуска-польскай граніцы. Старшыня Jusos Джэсіка Разенталь адзначыла: сітуацыя вельмі сур'ёзная, і яе трэба вырашыць да Каляд. Германія ў гэтым пытанні павінна ўзяць на сябе ролю першапраходца.

Польскія актывісты, якія дапамагаюць бежанцам, а таксама жыхары пагранічча напісалі агульнае пісьмо кіраўніку Еўракамісіі, у якім яны раскрытыкавалі палітыку ЕС і свайго ўрада ў адносінах да бежанцаў. Аб гэтым паведаміла Gazeta Wyborcza. Раней Еўракамісія прапанавала Польшчы, Літве і Латвіі заканадаўча зацвердзіць часовыя прававыя меры ў сувязі з сітуацыяй на беларуска-польскай граніцы. Гэты дакумент прадугледжвае прадаўжэнне тэрміну рэгістрацыі заяў аб прадастаўленні прыстанішча і паскарэнне працэдуры дэпартацыі мігрантаў, якія прыехалі ў краіны ЕС нелегальна.

Неабыякавыя грамадзяне перакананыя, што закон толькі пагоршыць становішча бежанцаў. «Нас бярэ жах ад таго, што праект, які парушае правы чалавека, павінен быць адобраны інстытутамі Еўрапейскага саюза», — гаворыцца ў лісце. Актывісты таксама запрасілі высокіх еўрачыноўнікаў прыехаць на беларуска-польскую мяжу і ацаніць рэальны стан спраў. Сярод тых, хто падпісаўся пад пісьмом, — грамадскія дзеячы, журналісты і радавыя грамадзяне.

Паведамлялася, што Прэзідэнт Польшчы Анджэй Дуда, які наведаў дабрачынны канцэрт, а таксама сустрэўся ў Кузніцы з польскімі і саюзніцкімі вайскоўцамі па НАТА, «абаронцамі дэмакратыі», якія нясуць «ганаровую місію на ўсходняй граніцы». Gazeta Wyborcza апублікавала красамоўныя каментарыі чытачоў: «Ганьба! Людзі гінуць на граніцы, а яны ладзяць прапагандысцкія канцэрты...».

Бельгійская газета Le Soir апублікавала ліст вядомага брытанскага сцэнарыста Пола Лаверці, лаўрэата Венецыянскага і Канскага кінафестываляў, адрасаваны старшыні Еўракамісіі Урсуле фон дэр Ляен, дзе акцэнт робіцца на жорсткасці, з якой сутыкаюцца бежанцы, што спрабуюць трапіць у Еўрасаюз, з боку сіл правапарадку краін — членаў ЕС. Аўтар звароту заклікаў кіраўніка ЕК пакласці канец гвалту, які здзяйсняецца пагранічнымі сіламі краін, што ўваходзяць у ЕС.

«Жазэп Барэль займаецца ашуканствам»

Для еўрапейскай дыпламатыі лёсы мігрантаў — толькі чарговае ўяўнае поле бою. Гэта адзначыў прэс-сакратар МЗС Беларусі Анатоль Глаз, адказваючы на пытанне пра заяву высокага прадстаўніка ЕС аб нібыта перамозе еўрапейскай дыпламатыі ў міграцыйным крызісе.

«Вельмі шкада еўрапейскую дыпламатыю, калі яны мысляць такімі катэгорыямі. Ваяўнічая рыторыка, адны карныя меры і поўная адсутнасць адказнасці за наступствы, — падкрэсліў афіцыйны прадстаўнік беларускага знешнепалітычнага ведамства. — Філосаф Насім Талеб называе такіх дзеячаў інтэрвенцыяністамі. Сумна, што лёсы людзей для іх — толькі чарговае ўяўнае поле бою».

«Праблемы бежанцаў, іх гібель на граніцы, раздзеленыя сем'і, цяжкасці бізнесу ў зоне НС і транспартны калапс асабліва не хвалююць такую еўрапейскую дыпламатыю. Ніякіх слоў аб высокіх каштоўнасцях і правах чалавека. Затое размовы пра перамогу. Па сутнасці ж, Жазэп Барэль займаецца ашуканствам», — адзначылі ў МЗС.

«Ён зноў замоўчвае галоўнае — за апошнія дзесяцігоддзе краіны НАТА, сярод якіх члены ЕС, на чале з ЗША сталі сапраўдны машынай, што вырабляе беженцаў у сусветным маштабе, — гаворыцца ў каментарыі афіцыйнага прадстаўніка беларускага міністэрства замежных спраў. — І ідуць яны рознымі маршрутамі. Увесь свет добра помніць кадры 2015—2016 гадоў, калі бежанцы месяцамі туліліся пад адкрытым небам у еўрапейскіх сталіцах. Не гаворачы ўжо пра чалавечыя ахвяры ў рэгіёне Міжземнамор'я, Ла-Манша і польскіх лясах».

«І гэта не ў Беларусі, а за пару кіламетраў ад кабінета спадара Барэля бежанцы зашывалі сабе раты ў спробе прыцягнуць увагу да сваіх праблем. Ён таксама ні слова не сказаў аб тым, што ў бягучай сітуацыі менавіта Беларусь праявіла добрую волю і гуманізм, садзейнічае рэпатрыяцыі, размясціла і накарміла за свой кошт каля дзвюх тысяч чалавек, якіх з боку ЕС палівалі ядахімікатамі і слёзатачывым газам», — заўважыў Анатоль Глаз.

Прадстаўнік МЗС таксама звярнуў увагу: «Бравая еўрапейская дыпламатыя пры гэтым зрабіла ўсё, каб паглыбіць праблему. А затым у сваім стылі прыслала дэлегацыю, якая ўсяго наабяцала, але нічога не зрабіла. Так і «перамаглі». Такім чынам, без гэтай самай добрай волі Мінска еўрачыноўнік наўрад ці змог бы так рапартаваць аб сваім адзіным «дасягненні» за год».

«Мы па-ранейшаму чакаем, што Еўрапейскі саюз замест злараднасці праявіць адказнасць, пройдзе сваю частку шляху, будзе выконваць узятыя на сябе дамоўленасці ў інтарэсах вырашэння праблем людзей, што дасць магчымасць частцы мігрантаў уз'яднацца напярэдадні навагодніх свят са сваімі сем'ямі, якія знаходзяцца ў краінах ЕС», — адзначылі ў беларускім знешнепалітычным ведамстве.

Ідэалогія людскасці

Еўрапейскі саюз не жадае весці перагаворы з Беларуссю па крызісе з бежанцамі. Аб гэтым Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка заявіў у інтэрв'ю турэцкай тэлерадыёкампаніі TRT. Інтэрв'юер пацікавілася, як праходзяць перагаворы з ЕС па міграцыйным крызісе. «Ніяк. Яны ў гэтым можа і зацікаўлены, але рабіць нічога ў гэтым плане не хочуць. А ім і не трэба нічога рабіць. Ім патрэбна прычына націску на Беларусь, — заявіў беларускі лідар. — Таму яны не ўдзельнічаюць у гэтых перагаворах. Хоць і адказныя асобы былі назначаны з іх боку, якія павінны былі весці з намі перагаворы. Але, напэўна, вельмі занятыя. Праблем у ЕС цяпер вялікая колькасць, таму не да таго, як мы разумеем».

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што людзі бягуць з Ірака, Сірыі, Афганістана і іншых краін, таму што ЗША разам са сваімі еўрапейскімі і іншымі сатэлітамі ўварваліся на тэрыторыю гэтых дзяржаў. «Прычыну не будзем называць, мы яе добра ведаем. Яна банальная. І знішчылі практычна гэтыя дзяржавы. У гэтых людзей няма жылля, у іх няма магчымасці накарміць, адзець сваіх дзяцей. Але самае страшнае — няма перспектывы на будучыню, асабліва ў іх дзяцей. Таму яны сталі бежанцамі і па розных маршрутах пайшлі туды, куды іх паклікалі, — у ЕС. У прыватнасці, Германію, старыя краіны Еўропы — Вялікабрытанію, Францыю, Італію, Іспанію», — сказаў Прэзідэнт. Пры гэтым, заўважыў ён, ёсць розныя маршруты для пранікнення бежанцаў у Еўрасаюз, у тым ліку праз Міжземнае мора, Балканы, а апошнім часам і праз Беларусь.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што нікога з бежанцаў не прымушаюць пакідаць Беларусь і вяртацца на радзіму. «Ні ў якім разе. Гэта мною ім абяцана, — заявіў Прэзідэнт. — Скажыце мне хоць адзін факт і назавіце таго чалавека, якога прымушаюць выехаць на радзіму, і я асабіста разбяруся з гэтым. Мы не варвары, каб гнаць людзей туды, дзе ім пагражае смерць. Людзі там не проста жыць не могуць: яны разумеюць, што, вярнуўшыся назад на радзіму, яны загінуць. Таму мы ні ў якім разе не гонім людзей назад».

У той жа час, адзначыў кіраўнік дзяржавы, бежанцам, якія знаходзяцца на беларуска-польскай граніцы, «рэкамендуюць вызначыцца са сваім далейшым лёсам». «На вуліцы зіма, і вы бачыце, які холад. Яны проста з дзеткамі там не вытрымаюць, — звярнуў увагу Аляксандр Лукашэнка. — І потым, мы ж іх пастаянна абслугоўваем: і гандаль, і ў сацыяльным плане, пачынаючы ад харчавання, адзення, лазневыя, пральныя мерапрыемствы і заканчваючы лячэннем, асабліва дзяцей. Нам гэта нятанна абыходзіцца, таму людзі павінны вызначыцца, што яны будуць рабіць сёння, заўтра і паслязаўтра. Мы да гэтага іх пабуджаем, але ні ў якім разе мы іх не будзем сілай вяртаць дадому». Прэзідэнт дадаў, што ідэалогія Беларусі тут простая — калі сёння ты дапамагаеш іншым людзям, якія трапілі ў бяду, то наступны раз дапамогуць табе.

Пётр ДУНЬКО.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Пуцін і Сі Цзіньпін абмеркавалі ідэю падрыхтоўкі саміту «пяцёркі» Савета бяспекі ААН

Прэзідэнт РФ Уладзімір Пуцін і старшыня КНР Сі Цзіньпін падчас перагавораў па відэасувязі абмеркавалі ідэю РФ аб падрыхтоўцы саміту «пяцёркі» членаў СБ ААН, яны лічаць неабходным ажыццявіць яе налета, заўважыў журналістам памочнік расійскага лідара Юрый Ушакоў, паведаміла РІА «Навіны». «Акрамя таго, прэзідэнт і старшыня адзначылі, што супрацоўніцтва па міжнародных пытаннях развіваецца вельмі паспяхова, і ўвогуле заўважылі, што расійска-кітайскае ўзаемадзеянне з'яўляецца стабілізацыйным фактарам у міжнародных справах, — сказаў Ушакоў. — І ў дадзеным кантэксце яны абмеркавалі расійскую ідэю аб падрыхтоўцы і правядзенні саміту «пяцёркі» пастаянных членаў Савета Бяспекі ААН. Абодва лідары лічаць гэтую ідэю вельмі карыснай».

Цэны на газ у Еўропе перавысілі $1550 за тысячу кубаметраў

Пра гэта сведчаць дадзеныя лонданскай біржы ICE, паведаміла РІА «Навіны». Кошт газу на форвардным рынку таксама працягвае расці. Сярэдні кошт студзеньскіх ф'ючарсаў у мінулым месяцы склаў $960, цяпер жа аналагічны паказчык вырас амаль да $1190. Сярэдняя цана на споце ў лістападзе амаль дайшла да $950, цяпер аналагічны паказчык наблізіўся да рэкорднай адзнакі $1130. Па выніках мінулага тыдня цэны на ICE Futures і Spot TTF замацаваліся на ўзроўні вышэй за $1200 за тысячу кубаметраў. Адчувальны рост цэн на газ у Еўропе пачаўся з красавіка-мая, калі сярэдняя цана на споце па TTF вагалася ў дыяпазоне $250-300 за тысячу кубаметраў. Эксперты звязваюць гэты працэс з нізкай запоўненасцю еўрапейскіх падземных сховішчаў, абмежаваннем прапановы з боку асноўных пастаўшчыкоў і высокім попытам на звадкаваны прыродны газ у Азіі.

Касмічны зонд Parker упершыню «закрануў» Сонца

Упершыню ў гісторыі касмічны карабель Parker Solar Probe «закрануў» Сонца. Пра гэта паведамляецца на сайце NASA. Касмічны апарат праляцеў праз верхнія пласты атмасферы Сонца, дзе тэмпература можа дасягаць каля 500 тысяч градусаў Цэльсія, і ўзяў адтуль узоры часціц і магнітных палёў. «Дакрананне да Сонца з дапамогай сонечнага зонда Parker Solar Probe — манументальны момант для сонечнай навукі і сапраўды выдатны подзвіг», — сказаў Томас Зурбухен, памочнік адміністратара ўпраўлення навуковай місіі ў штаб-кватэры NASA ў Вашынгтоне. Місія зонда дазволіць вучоным зразумець прычыны «награвання сонечнай кароны» і развіцця сонечнага ветру да звышгукавых хуткасцяў. Вымярэнні кароны будуць мець вырашальнае значэнне для разумення і прагназавання экстрэмальных з'яў касмічнага надвор'я, якія могуць парушыць сувязь і пашкодзіць спадарожнікі вакол Зямлі, лічаць вучоныя.

Марафон дабра

Радасць, якая заўсёды з табой...

Сотні «звяздоўскіх» кніг атрымаюць дзеці падчас навагодніх свят

Вось і надышоў час навагодняга настрою: у паветры ўжо лунае прыемны водар свята, у вокнах офісаў і ў вітрынах крам з'яўляюцца ёлачкі-прыгажуні, вуліцы гарадоў запаўняюць гандлёвыя палаткі з мішурой і ёлачнымі цацкамі. Людзі паглыбляюцца ў прыемную перадднавагоднюю мітусню.

Маленькія жыхары яркага рознакаляровага будынка, які размясціўся на ўзгорыстай і лясістай мясцовасці гарадскога пасёлка Івянец, чакалі сваіх першых святочных гасцей. Днямі Беларуская ўніверсальная таварная біржа сумесна з выдавецкім домам «Звязда» адкрылі сезон навагодніх цудаў у Івянецкім доме-інтэрнаце для дзяцей-інвалідаў з асабліваснямі фізічнага развіцця. Так прадстаўнікі арганізацый далучыліся да традыцыйнай рэспубліканскай акцыі «Нашы дзеці», якая сёлета праходзіць з 14 снежня да 14 студзеня.

Новыя сябры прывезлі выхаванцам дома-інтэрната дзесяць каробак ярка ілюстраваных кніг з казкамі, апавяданнямі, аповесцямі, напісанымі беларускімі пісьменнікамі.

— У нашай установе ёсць бібліятэка, і, натуральна, для нас вельмі важна папаўняць яе фонд кніжнымі навінкамі, — кажа дырэктар дома-інтэрната Алена Петрашкевіч. — У нас многія дзеці любяць кнігі, адны чытаюць, іншыя — разглядаюць яркія карцінкі. Добра, што новыя выданні поўныя такога задавальнення!

У бібліятэцы для дзяцей часта ладзяць тэматычныя мерапрыемствы, каб прыцягнуць увагу малых да кнігі. Таму і не дзіўна, што менавіта тут у некаторых дзяцей развіваецца паэтычны талент. Дзяўчынка Аксана рашылася нават пачытаць гасцям адзін са сваіх вершаў, які прысвяціла маме. Напісаны верш на роднай беларускай мове.

У доме-інтэрнаце дарослыя арганізавалі і своеасаблівы буккросінг. Недалёка ад бібліятэкі, якая працуе ў пэўны час, размешчаны стэлаж з кнігамі, асартымент якіх мяняюць раз на два тыдні. Кнігі знаходзяцца ў вольным доступе ў любы час, пры жаданні можна ўзяць любую з сабой, каб пачытаць.

Аліса таксама любіць чытаць, і нават падчас урока ў яе, апроч падручнікаў, можна ўбачыць на стале мастацкія кнігі. Гэтым разам госці адзначылі, што дзяўчынка захопленая чытаннем аповесці «Прыгоды Алісы» Кіра Булычова.

А вось Дар'я з дзявятага класа адзначана спецыяльнай зоркай. Гэтую «залатую зорачку» атрымліваюць за любоў

да чытання. Дар'я, прачытаўшы чарговую аповесць, адзначае гэта ў спецыяльным сшытку, які называецца «Чытацкая скарбонка». У канцы кожнай чвэрці выхавальнік падводзіць вынікі і вызначае пераможцу — хлопцаў і дзяўчат, якія прачыталі кніг больш за іншых.

Трэцякласнік Ян не стаў расказваць гасцям пра кнігі. У яго была іншая цудоўная навіна — Ян упершыню ў жыцці ўбачыўся са сваёй роднай мамай. Малы ездзіў да яе ў Слуцк і яны разам гулялі, шмат размаўлялі. Гэтая сустрэча адбылася дзякуючы карпатлівай рабоце сацыяльнага педагога і псіхолага. Цяпер хлопчык ведае, што можа патэлефанаваць сваёй матулі і хоць бы проста з ёй пагаварыць. І гэта, лічыць ён, самы сапраўдны навагодні цуд.

Пяцікласнік Мацвей — часты наведвальнік школьнай бібліятэкі. Праўда, ходзіць ён туды не па кнігі, а да любімага бібліятэкара. Мацвей — галоўны памочнік супрацоўніцы школьнага «храма». Днямі хлопчык разам з ёй упрыгожваў бібліятэку да Новага года, нават зрабілі ёлку з кніг.

— Нашы дзеці вельмі творчыя і чулыя, — кажа дырэктар дома-інтэрната. — Для іх вельмі важна адчуваць цяпло і ўвагу з боку дарослых, яны такім чынам усведамляюць, што патрэбныя. Гэта надае сіл тварыць і расці над сабой.

У майстэрнях установы выхаванцы раскрываюць свае таленты. Хтосьці вучыцца шыць у швейнай майстэрні, нехта — працаваць з дрэвам у сталярнай майстэрні, а некаторыя авалодваюць мастацтвам стварэння вырабаў з гліны ў ганчарнай майстэрні. Дарэчы, ў апошняй госці атрымалі памятныя падарункі ад жыхароў гэтага цёплага дома — прыгожыя фігуркі чарапашак і соў.

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

— Хто хоць бы раз зрабіў добрую справу, паўдзельнічаў у дабрачынных акцыях і ўбачыў вочы дзяцей, поўныя хвалявання, шчасця, падзякі і надзеі, той адчуў неверагодную і ні з чым не параўнальную радасць. Сёння нам пашчасціла зведаць гэтае пачуццё дзякуючы нашым новым маленькім сябрам, — адзначыў **намеснік дырэктара выдавецкага дома «Звязда» Уладзімір МОСІН.**

Падчас урачыстай цырымоніі перадачы сертыфіката на падараныя кнігі дзеці з вялікай цікавасцю разглядалі не толькі атрыманыя падарункі, але і гасцей. Выхаванцы дома-інтэрната шчыра ўсміхаліся і з задавальненнем фатаграфаваліся на памяць са сваімі новымі сябрамі. У гэтай прыемнай мітусні таксама адчувалася чараўніцтва, якога з нецярпеннем чакаюць падчас свят і дарослыя, і дзеці.

— Ужо не першы год напярэдадні Новага года і Каляд па ўсёй краіне праходзіць традыцыйная святочная акцыя «Нашы дзеці», — сказаў **старшыня праўлення ААТ «Беларуская ўніверсальная таварная біржа» Аляксандр АСМАЛОЎСКІ.** — Гэта ўнікальны праект, своеасаблівы марафон дабрыні, які нагадвае нам пра простыя чалавечыя каштоўнасці. Такія як любоў, клопат, добрасардэчнасць. Сёння як ніколі ўсё гэта вельмі важна. Наша арганізацыя актыўна ўдзельнічае ў згаданым праекце. Івянецкі дом-інтэрнат для дзяцей-інвалідаў — першы прыпынак на дыстанцыі дабра. Напярэдадні нас чакаюць сустрэчы з выхаванцамі Панямуньскага дзіцячага дома, SOS — Дзіцячай вёскі ў Мар'інай горцы і Мсціслаўскай школы-інтэрната для дзяцей з цяжкімі парушэннямі маўлення. Усе атрымаюць у падарунак займальныя і карысныя кнігі, якія, вельмі спадзяёмся, будуць прыносіць ім радасць на працягу многіх гадоў.

Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.

БУДУЧЫНЯ БЕЛАРУСКАЙ ШКОЛЫ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Важнай умовай дасягнення высокай якасці адукацыі з'яўляецца эфектыўная сістэма яе ацэнкі, — падкрэсліла Валянціна Гінчук. — Мы будзем удасканальваць нормы ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў, механізмы і формы маніторынгавых даследаванняў якасці адукацыі, рэспубліканскіх кантрольных работ па вучэбных прадметах. Добрым стымулам для ўдасканалення сістэмы ацэнкі якасці адукацыі стаў удзел Беларусі ў міжнароднай праграме па ацэнцы адукацыйных дасягненняў навучэнцаў PISA-2018. Вынікі, якія прадэманстравалі беларускія падлеткі, былі прааналізаваны і на падставе аналізу распрацаваны рэкамендацыі для ўсіх удзельнікаў адукацыйнага працэсу. Яны размешчаны на Нацыянальным адукацыйным партале, апублікаваны ў выглядзе брашур, накіраваны ва ўстановы адукацыі і павінны стаць падмуркам для ўдасканалення адукацыйнага працэсу. Чакаецца, што ў 2022 годзе Беларусь возьме ўдзел у міжнароднай праграме ацэнкі якасці адукацыі PISA ўжо другі раз.

Яшчэ адзін напрамак удасканалення арганізацыі сістэмы агульнай сярэдняй адукацыі — увядзенне незалежнай атэстацыі навучэнцаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі. Праект Кодэкса аб адукацыі прадугледжвае, што выніковыя іспыты па завяршэнні навучання і выхавання на III ступені агульнай сярэдняй адукацыі, гэта значыць у 11-м класе, па асобных вучэбных прадметах могуць праводзіцца ў выглядзе цэнтралізаванага экзамену. «Яго вынікі будуць залічвацца пры прыёме абітурыентаў для атрымання адукацыі на іншых узроўнях асноўнай адукацыі, — адзначыла дырэктар НІА. — Змест і навукова-метадычнае забеспячэнне агульнай сярэдняй адукацыі будзе ўдасканальвацца ў напрамку фарміравання функцыянальнай адукаванасці навучэнцаў, што адпавядае патрабаванням грамадства, якое дынамічна развіваецца. З гэтым звязаны навуковыя даследаванні, якія праводзяцца цяпер у Нацыянальным інстытуце адукацыі».

ПЕДАГОГ НОВАЙ ФАРМАЦЫІ

Пра змены ў сістэме прафесійнай падрыхтоўкі педагогаў, якія дыктуюцца часам і знайшлі адлюстраванне ў **Канцэпцыі развіцця сістэмы адукацыі да 2030 года,** расказала **прарэктар па навуковай рабоце Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка, доктар педагагічных навук, прафесар Ганна ТОРХАВА:**

— Хацелася б выдзеліць чатыры аспекты ўдасканалення педагагічнай адукацыі: яны датычацца адукацыйнай, навуковай дзейнасці, узаемасувязі з заказчыкамі кадраў і сацыяльнага партнёрства. Удасканаленне адукацыйнай дзейнасці прадугледжвае абнаўленне зместу і арганізацыю адукацыйнага працэсу на аснове прафесійных стандартаў.

Так, у будучых педагогаў дашкольнай і агульнай сярэдняй адукацыі (пакаленне 3+) павінны развівацца наступныя кампетэнцыі: здольнасць забяспечыць выхаванне асобы з гуманістычным светапоглядам, крытычным, сацыяльна і экалагічна арыентаваным мысленнем, актыўнай грамадзянскай пазіцыяй, нацыянальнай самасвядомасцю ва ўмовах адкрытага культурна-адукацыйнага асяроддзя; гатоўнасць да культурна-маральнага выхавання дзяцей, арганізацыі сацыяльна значных ініцыятыў навучэнцаў з апорай на найлепшыя традыцыі калектыўнага выхавання, уменне фарміраваць у іх устаноўку на здаровы спосаб жыцця, ажыццяўляць прафілактыку шкодных звычак, агрэсіі; валоданне навыкамі работы ў лічбавым адукацыйным асяроддзі; гатоўнасць да работы ва ўмовах інклюзіі і бесперапыннага асобаснага прафесійнага самаразвіцця.

Сацыяльна-эканамічная сітуацыя, якая дынамічна змяняецца, абумоўлівае неабходнасць падрыхтоўкі педагога новай фармацыі як драйвера ўстойлівага развіцця грамадства. Арыентацыя на падрыхтоўку такога педагога дасць магчымасць значна паскорыць пераход да новай парадыгмы адукацыі, галоўнымі адметнымі рысамі якой будуць вучэнне замест навучання, развіццё здольнасцяў самім набываць веды, творча іх перапрацоўваць, у тым ліку з выкарыстаннем інфармацыйных рэсурсаў. Неабходна развіць здольнасць думаць крэатыўна, ствараць новае, сфарміраваць функцыянальную адукаванасць у сучасным разуменні.

АРЫЕНЦІРЫ ДЛЯ ПЕДАГАГІЧНАЙ НАВУКІ

Ганна Торхава падкрэсліла, што навукова-даследчая і навукова-метадычная работа ў галіне адукацыі ў найбліжэйшыя гады павінна быць арыентавана на правядзенне фундаментальных і прыкладных міждысцыплінарных даследаванняў, вынікі якіх павінны стаць асновай абнаўлення зместу, формаў, метадаў, тэхналогій, навукова-метадычнага забеспячэння сістэмы адукацыі на ўсіх узроўнях.

«У БДПУ распрацавана праблемнае поле прыярытэтных псіхолага-педагагічных даследаванняў на сярэднетэрміновую перспектыву, якія з'яўляюцца арыенцірам для вызначэння тэматыкі магістарскіх, кандыдацкіх, доктарскіх дысертацый па педагагічных навуках. Гэта поле пастаянна актуалізуецца з улікам новых выклікаў і тэндэнцый у адукацыі. Сёння існуе сур'ёзная праблема адтоку маладых вучоных з педагагічнай навукі, таму развіццё навукова-педагагічных школ і павелічэнне іх колькасці разглядаецца як залог забеспячэння пераемнасці пакаленняў у адукацыйнай і навуковай дзейнасці», — падкрэсліла прарэктар БДПУ.

Адносна ўзаемадзеяння з заказчыкамі кадраў важна, па-першае, пашырэнне ўдзелу работадаўцаў у падрыхтоўцы педагагічных кадраў, запатрабаваных сучасным рынкам працы. Па-другое, удасканаленне адукацыйнай практыкі за кошт трансферу актуальных дасягненняў псіхолага-педагагічнай навукі і сусветнага вопыту ў сферы адукацыі. Асабліва важны ўдзел работадаўцаў у прадастаўленні баз для навучальных заняткаў, вытворчай практыкі студэнтаў, кіраванні ў дзейнасцю, у тым ліку выкананні курсавых, дыпломных работ і магістарскіх дысертацый па заказах.

Ганна Торхава канстатавала, што без шырокага ўдзелу сеткі сацыяльных партнёраў немагчымае стварэнне развіццёвага адукацыйнага асяроддзя, развіццё асобы студэнта і будучага педагога. «Мы бачым рэалізацыю сацыяльнага партнёрства праз асобасна-прафесійнае развіццё будучых педагогаў не толькі ва ўмовах фармальнай прафесійнай адукацыі, але і сродкамі нефармальнай адукацыі, забеспячэнне прафесійнай мабільнасці і гатоўнасці самаўдасканальвацца і развівацца на працягу ўсяго жыцця, праз уключэнне будучых педагогаў у валанцёрскую і адукацыйную дзейнасць з рознымі катэгорыямі насельніцтва, павышэнне іміджу педагагічнай прафесіі ў грамадстве. Пашырэнне формаў сацыяльнага партнёрства будзе садзейнічаць увядзенню новых спецыяльнасцяў і прафілізацый для падрыхтоўкі кадраў для арганізацый сацыяльнай абароны, культуры, навукі і бізнесу. Выпускнікоў гэтых спецыяльнасцяў павінны вылучаць узмоцненая псіхолага-педагагічная падрыхтоўка і гатоўнасць да работы з людзьмі ў розных сферах. Усе гэтыя напрамкі ўдасканалення педагагічнай адукацыі закладзены ў Канцэпцыю развіцця сістэмы адукацыі да 2030 года і ўжо паспяхова рэалізоўваюцца», — дадала Ганна Торхава.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Сямейная газета

Выпуск № 23 (182)

АРКУШ ЖАДАННЯЎ

У адзін з вечароў, калі ўсё навокал зіхацела ад снегу, мы з маім трохгадовым сынам Арцеміем нарэшце селі пісаць пісьмо Дзеду Марозу. І калі ў папярэднія гады Цёмік яшчэ мала разумеў, адкуль на працягу навагодніх і калядных свят пад ёлкай з'яўляюцца падарункі, то сёлета ён добра ведае, хто спонсар яго жаданняў.

У свой час у Дзеда Мароза я верыла даволі доўга. Таксама пісала пісьмы або агучвала свае жаданні бацькам, якія, як я тады была ўпэўнена, абавязкова сустрэнуцца з Дзедам і перададуць яму маю просьбу. Праўда, жаданні ў нас, дзяцей 1990-х, былі куды больш сціплыя. Я, шчыра кажучы, не памятаю, каб праселa ў Дзеда Мароза больш чым адзін падарунак. Гэта была то нейкая цацка, то рэч, то часопіс з налепкамі, аднойчы наборчык модных тады дзіцячай касметыкі «Маленькая фея» пажадала... А потым, перад самым Новым годам, знайшла яго на верхняй паліцы ў секцыі (хто, прызнайцеся, не шукаў падарункі сярод рэчаў бацькоў?). Аднак гэта ніколькі не падарвала маю веру ў Дзеда Мароза — значыць, думала я, прынёс загадзя, бацькі проста потым пакладуць пад ёлку.

Сучасныя ж дзеці адным падарункам не абмяжоўваюцца. Цёмік, напрыклад, у сваім лісце намаляваў (не без маёй дапамогі, вядома) і экскаватар, і эвакуатар, і грузавік, і пажарную машыну. Акрамя таго, у гэтым аркушы жаданняў з'явілася кніга казак (чытаць мы перад сном любім, таму ўсе казкі як у сваёй, так і ў бацькоўскай хаце ўжо перачыталі) і пакунак цукерак, які, па словах Арцемія, ён заказвае ў Дзеда Мароза выключна для мяне, бо яго перш-наперш цікавяць машыны. Іх, вядома, у малога поўна: тры кватэры (свая і абедзве бабуль-дзядуль застаўлены — і не маленькімі мадэльнымі, а цацачнымі вялікагрузамі). Пажарныя сярод іх таксама ёсць, але ж — аргумент малога — яны не ў Мінску! «Дык іх жа можна прывезці», — паспрабавала я выкрасліць адну машыну са спіса. «А на вёсцы, а ў бабулі Аліны я з чым буду гуляць?» — папракнуў недальнабачную матулю Арцёмка.

Адным словам, паправак у ліст Дзеду Марозу ўнесці не атрымалася. У такім выглядзе і паклалі на падаконнік: ноччу яго павінен быў забраць той самы персанаж (добра, што раніцай я аб гэтым своечасова ўспомніла). Перад гэтым аркуш з жаданнямі сфатаграфавала і адправіла мужу: маўляў, рыхтуй кашалёк, Дзед Мароз!

Цацкі, асабліва вялікіх памераў, як любіць сын, цяпер каштуюць нямала грошай. Таму, калі выканаць усе жаданні малога, неабходна сур'ёзна патраціцца. Добра, што ў нас Дзед Мароз калектыўны: мы з мужам, мае бацькі і свякроў, якія, каб не тлуміць сабе галаву падарункамі, кожны год прапаноўваюць падарыць малому тое, што ён хоча. Таму гэтым разам копію аркуша з жаданнямі атрымаюць яшчэ і яны, а там застанецца вызначыцца, хто і што купіць, а пасля пакладзе пад ёлачку.

У маім дзяцінстве бабулі і дзядулі, хоць былі яны ў мяне надзвычай добрыя і ўважлівыя, на Новы год падарункаў не дарылі — не было нават такой моды. Максімум пачастуюць цукеркамі, шакаладам, іншай смакатой. Ды і хросныя бацькі дарылі падарункі толькі на Вялікдзень, а калі пашанцуе — яшчэ і на дзень нараджэння. Цяперашнія ж — зноў жа мода — клапоцяцца і аб тым, што падарыць сваім хрэснікам яшчэ і на Новы год. Летась, нягледзячы на тое, што жылі мы, а адпаведна і святкавалі Новы год ды Каляды, у вёсцы, навагоднія падарункі Цёмік усё роўна атрымаў. Хросная маці даслала вялікі пакунак з машынамі і цукеркамі па пошце. Колькі радасці было ў малога, калі мы яго забіралі! І цяпер перад вачыма: дзед, мой бацька, вязе Арцемія на санках, а той, у сваю чаргу, моцна трымае навагодні падарунак ад хроснай. Хросны ж бацька пра малога таксама паклапаціўся: набор з усё тымі ж машынамі ды цукеркамі, а яшчэ цацачным сімвалам мінулага года — Бычком, перадаў праз сваю маці, якая жыве побач з маёй свякроўкай.

Распесцілі мы сваіх дзяцей! Я ў сваім дзяцінстве на Новы год ды Каляды падарункаў ад хросных нават не чакала. Праўда, адзін год усё ж такі быў выключэннем, калі да нас на свята прыехала мая родная цётка, па сумяшчальніцтве хросная маці. У навагоднюю ноч, пакуль я выходзіла з пакоя, дзе было застолле, яна ўмудрылася па чарзе пакласці пад лясную прыгажуню некалькі мяккіх цацак. Тады я, вядома, думала, што гэта справа рук Дзеда Мароза ці Снягуркі, і вельмі здзіўлялася, што, як ніколі, яны адорваюць мяне. Гэта сёння я добра ведаю, што пра мой настрой клапацілася цётка Алена.

Для сучасных дзяцей, як і для нас у свой час, у большасці сваёй усё роўна, хто спонсар іх жаданняў. Вядома, яны пакуль вераць у Дзеда Мароза. Няхай гэта будзе як мага даўжэй! А таму рэпутацыя казачнага персанажа павінна быць самая высокая, што азначае толькі адно: усе падарункі, якія значацца ў аркушы жаданняў, разам ці па чарзе абавязкова павінны з'явіцца пад ёлачкай, як бы моцна гэта ні ўдарыла па кашальку.

Вераніка КАНЮТА.

Тыя, хто побач

Юлія АРЦЮХ:

«МАЛА ХТО ВЕДАЕ, ЯКІ ЖЫЦЦЁВЫ ШЛЯХ Я ПРАЙШЛА»

Сённяшняя госця «Сямейнай газеты» — тэлевядучая, грамадскі дзеяч, шматдзетная маці, жонка і цудоўная гаспадыня Юлія Арцюх. Яна лічыць, што трэба клапаціцца не толькі пра сябе, але і прыносіць карысць людзям. Юлія — старшыня рэспубліканскага грамадскага аб'яднання дапамогі дзецям, хворых на фенілкетанурыю «Будучыня без межаў», дзякуючы якой у нашай краіне наладжана вытворчасць прадуктаў харчавання для хворых дзяцей. Аўтарская рубрыка «Нягладка» на СТБ — тое, з чаго яна пачала свой шлях у журналістыку, і тое, з чым працягвае жыць цяпер. З лістапада тэлевядучая стала весці праграму «У людзях» на канале РТР-Беларусь, а яшчэ яна займаецца навуковай дзейнасцю. Як ёй удаецца сумяшчаць усё гэта, а таксама заставацца прыгожай і далікатнай жанчынай, нам раскажа сама Юля.

ЁСЦЬ ЧЫМ ПАДЗЯЛІЦЦА

— У нас на СТБ шмат аўтарскіх рубрык, і ў гэтым заслуга генеральнага дырэктара канала Кірыла Казакова. Таму ў кожнага ёсць магчымасць даносіць сваё меркаванне, пазіцыю праз асабістыя адчуванні. Напэўна, час прадыктаваў гэты момант, і сапраўды важна даць шанец сказаць. Я непрафесійны журналіст, спецыяльнай адукацыі няма. Мабыць, мая рубрыка і стала незвычайнай, таму што ў студыю прыйшоў чалавек «з народа» і выказаў сваё меркаванне, але праз прызму ўласнага вопыту. Ад самага першага выпуску я сама пішу тэксты для сваёй перадачы, аднак над яе афармленнем, ідэяй працуе цэлая каманда прафесіяналаў.

З дзяцінства бачыла, як жыве мая сям'я, як жывуць мае бабулі і дзядулі і, натуральна, успрымала сваё жыццё добрым. Таму ёсць чым падзяліцца, дапамагае вопыт. Не магу сказаць, што мой лёс пасрэдны. Ёсць людзі, якіх, дзякуй богу, не закранулі пэўныя цяжкасці — хвароба блізкіх ці асабістая або прафесійныя ўзрушэнні, калі ты атрымліваеш спачатку адну адукацыю ў пэўнай сферы, а пасля так складваецца лёс, што неабходна працаваць па іншай, і табе даводзіцца праходзіць гэты шлях самастойна.

(Заканчэнне на 3-й стар. «СГ».)

Сталеем!

ПЕРШАЕ ПРАЦОЎНАЕ

Дзе і як зарабляюць беларускія падлеткі

Сцёпу ў доме ведалі ўсе — яму лёгка даваліся матэматыка і гісторыя. Але галоўнае — ён умеў растлумачыць складаныя рэчы простай мовай. Гэтую асаблівасць заўважыла яго мама Ала, калі ён дапамагаў свайму малодшаму брату з урокамі. А аднойчы за кубачкам гарбаты суседка расказала маме Але, што яе дачцэ ніяк не даецца матэматыка. Вось так, за кухонным сталом, было вырашана прыслаць на дапамогу дванаццацігадовага Сцёпу. Гэта можна было назваць першым працоўным месцам юнака, бо, як толькі адзнакі па матэматыцы ў дзяўчынкі ішлі ўверх, яму ў якасці падзякі давалі пяць рублёў. Неўзабаве пра Сцёпу даведаліся і іншыя суседзі. Так хлопчык за тыдзень мог зарабіць ужо дваццаць рублёў і часам нават купляў дадому прадукты, не беручы на гэта грошы ў маці.

Насамрэч у нашай краіне пачаць афіцыйна працаваць дазволена толькі падлеткам, якім ужо ёсць 14 гадоў, і тое толькі з пісьмовага дазволу бацькоў. Яны не могуць працаваць столькі ж, колькі і дарослыя. Для падлеткаў устаноўлена скарочаная працягласць працоўнага часу. Напрыклад, ва ўзросце ад 14 да 16 гадоў — не больш за 23 гадзіны ў тыдзень, а з 16 да 18 гадоў — не больш за 35 гадзін у тыдзень.

(Заканчэнне на 3-й стар. «СГ».)

ВЯСЁЛАЕ ЧАРАДЗЕЙСТВА для дарослых і малых

Чарадзейныя сядзібы з сярэдзіны снежня адчыняць дзверы ў казку як мінімум у 13 раёнах Гродзенскай вобласці. Гасцей будуць прывячаць і весяліць Бераст-Зюзя, Баба Завіруха, Снежная каралева ды іншыя персанажы. Розныя па тэматыцы і гульнях, але аднолькава вясёлыя і поўныя нечаканых сюрпрызаў і падарункаў святочныя мерапрыемствы парадуюць дзятву ў многіх мястэчках.

Адзінаццаты святочны сезон распачнецца, напрыклад, у вёсцы Залейкі Іўеўскага раёна ў сядзібе Дзеда Зімніка і Бабы Завірухі. Госці адправяцца ў зімні лес, завітаюць да Чырвонай Шапачкі і Лісы-кумы, адшукаюць хованку Лесуна... А яшчэ ім прыйдзецца прайсці праз выпрабаванні ад Снегавіка і Кашчэя Бессмяротнага. У самой жа сядзібе падарожнікаў чакае інтэрактыўны спектакль пад адкрытым небам «Залейкаўскае каралеўства, або Прыгоды Снягуркі» ў пастаноўцы народнага тэатра «Зялёны фургон».

А ў Бераставіцкім раёне за два тыдні да Новага года запрацуе ўпадабаная многімі рэзідэнцыя Бераст-Зюзі і Пані Завірухі. Каб сустрэцца з казачнымі гаспадарамі, наведвальнікам прыйдзецца пераадолець мноства перашкод і прайсці квэст.

Анімацыйная праграма «Сакрэтная служба Дзеда Мароза, або Аперацыя «З Новым годам!» пачнецца з 17 снежня ў рэзідэнцыі Дзеда Мароза ў Карэліцкім раённым цэнтры культуры і народнай творчасці. Арганізатары папярэджваюць, што ахвотным паўдзельнічаць у пераднавагодняй прыгодніцкай гісторыі і фота-флэшмобе трэба папярэдне запісацца на святкаванне. А ў Мірскім замку 18 снежня пад пушачныя стрэлы і танец «Маразуля» апоўдні запаляць навагоднюю ёлку, распачаўшы чарговы калядны сезон.

Між тым, святочны фэст ужо распачаўся на Навагрудчыне, на беразе возера Свіцязь у сядзібе Дзеда Мароза і Снягуркі ў эколага-інфармацыйным цэнтры «У гасцях у 12 месяцаў». Першыя наведвальнікі адразу трапілі ў дэтэктыўную гісторыю. Разам з Лесуном яны адправіліся на пошукі тых, хто абрабаваў гаспадароў сядзібы... Прайшоўшы ўсе перашкоды, малыя сустрэліся з Дзедам Марозам і Снягуркай ды пачаставаліся прысмакамі. У навагрудскай рэзідэнцыі гасцям прапануюць таксама падарожжа ў краіну Майстарград — на майстар-клас па вырабе навагодніх сувеніраў, а Любчанская ключніца з радасцю падзеліцца сакрэтамі Любчанскага замка і пачастуе арыгінальнымі ласункамі.

У Ашмянскім раёне запрацуюць адразу дзве рэзідэнцыі: у дзіцячым летніку «Дружба» і ў Гальшанскім замку. Каля сцен апошняга госці трапяць у эпоху Сярэднявечча, будуць разгадваць навагодні квэст, катацца ў карэце і частавацца знакамітымі гальшанскімі пернікамі. Казачныя сядзібы адкрыюцца і ў іншых раёнах Гродзеншчыны. А ў абласным цэнтры рэзідэнцыя пачне работу сёння, 16 снежня, у цэнтры рамёстваў «Спадчына».

Ірына СІДАРОК.

Духоўны свет

СВЕТЛАЕ ХРЫСТОВА НАРАДЖЭННЕ

Як не страціць за «бліскучай мішурой» глыбокі сэнс гэтага свята?

Нараджэнне Хрыстова — адно з найвялікшых свят у хрысціянскім календары. Каталікі і пратэстанты адзначаюць яго 25 снежня, праваслаўныя Каляды святкуюцца 7 студзеня. Але незалежна ад даты з набліжэннем гэтага свята вернікі ўжо шмат стагоддзяў перажываюць радасную падзею нараджэння Сына Божага, пасланага Усявышнім для збаўлення чалавецтва.

— У калядныя дні перад намі прыадкрываецца таямніца нараджэння Бога, — кажа **настаяцель Прыхода свяціцеля Спірыдона Трыміфунцкага ў Мінску святар Аляксандр ПАЛЬЧЭЎСКІ**. — Гэта нешта неспасціжнае: бязмежны Бог па сваёй волі прыняў абмежаванні — чалавечым целам, сіламі, неверагодна малым у параўнанні з вечнасцю тэрмінам чалавечага жыцця. Галоўная мэта, з якой гэта было зроблена, — любоў Бога да чалавека. Хрыстос прыйшоў у гэты свет, каб адкрыць людзям веды пра Бога, памёр на крыжы, уваскрос і праз усё гэта здзейсніў Адкупленне — даў чалавеку магчымасць духоўнага збавення.

Значнасць Нараджэння Хрыста немагчыма зразумець, не ведаючы гісторыі, апісанай у Евангеллі. Дзеве Марыі з'явіўся анёл і абвясціў, што яна народзіць немаўля мужчынскага полу, якому наканавана будзе памерці за грахі роду чалавечага. Калі ж Дзева Марыя ўжо павінна была нарадзіць, разам з Іосіфам ёй прыйшлося адправіцца ў Віфлеем (горад непадалёк ад Іерусаліма): у Рымскай імперыі праводзіўся перапіс насельніцтва, і кожны павінен быў з'явіцца ў горад, дзе нарадзіўся, а Іосіф быў родам з Віфлеема. Дарога была доўгая і цяжкая, усе гасцініцы аказаліся запоўненыя. Багародзіца і Іосіф знайшлі пячору каля Віфлеема, дзе ад непагадзі часта хаваліся пастухі. Там і нарадзіўся Збавіцель, і ў тое ж імгненне на небе з'явілася Віфлеемская зорка.

Чаму Хрыстос вырашыў прайсці чалавечы шлях — ад нараджэння і да смерці?

— Чалавек быў створаны для пазнання Бога. Але першыя людзі — Адам і Ева — парушылі запаведзь Божую, і грэх унёс падзел паміж Богам і чалавекам. Узнікла неабходнасць аднаўлення страчанага адзінства. Гасподзь прайшоў чалавечы шлях і аднавіў гэтую сувязь. Мэта Богаўвасаблення — гэта вяртанне чалавеку той часцінкі боскага, якая ў ім закладзена.

«БЛАЖЭННЫЯ ЧЫСТЫЯ СЭРЦАМ...»

Паводле Евангелля, першымі пакланіцца Збавіцелю прыйшлі пастухі. Пазней Віфлеемская зорка прывяла да Нованароджанага траіх вешчуноў, якія і прадраклі яму вялікую будучыню. Вешчуны прынеслі дарункі: золата, ладан і смірну. Імя дзіцяці далі Ісус, што значыць «Гасподзь ёсць Збаўленне», а пасля — Хрыстос, што значыць «Памазаннік». Гэтым пророкі падкрэслілі, што Ён ёсць Цар свету, які нясе людзям святло веры.

— Ісус прыйшоў на Зямлю не сярод раскошы, а ў прастаце і пакоры. І адкрываецца Бог перш за ўсё людзям простым, з чыстай душой і адкрытым сэрцам — таму першымі мелі гонар убачыць Яго пастухі. У Евангеллі сказана: «Шчаслівыя чыстыя сэрцам, бо яны Бога ўбачаць», — тлумачыць святар. — Пакланіцца Ісусу прыйшлі таксама вешчуны — то-бок людзі адукаваныя, мудрацы. Яны прыйшлі ўслед за Віфлеемскай зоркай, бо ведалі старажытнае прароцтва. Гэта значыць, праз веды, праз навуку таксама можна знайсці шлях да Бога.

Жорсткі цар Ірад, якому прадказалі нараджэнне сапраўднага Цара, спалохаўся за свой трон і загадаў забіць усіх немаўлят мужчынскага полу. Стражнікі вынішчылі ў навакольлях Іерусаліма ўсіх хлопчыкаў да двух гадоў — каля 14 тысяч дзяцей. Гэтыя дзеці лічацца першымі хрысціянскімі пакутнікамі. Марыя і Іосіф, ратуючы нованароджанага Хрыста, з'ехалі ў Егіпет. Вярнуліся ў Назарэт яны толькі пасля таго, як Ірад памёр.

Упершыню на Каляды ёлкі сталі ўпрыгожваць у Германіі ў VIII стагоддзі. Легенда абвяшчае: святы Баніфацый некалі прапаведаваў друідам, якія жылі ў лясах і пакланяліся дрэвам. Якраз на Каляды пастар ссек вялізны дуб, які лічыўся ў мясцовага насельніцтва святым дрэвам. Падаючы, дуб паваліў усе дрэвы вакол, і толькі гнуткая маладая ялінка не зламалася, а паднялася зноў. Місіянер усклікнуў: «Няхай жа гэтае дрэва будзе дрэвам Хрыста!». Вечназялёная елка сімвалізуе вечнае жыццё, дадзенае людзям Хрыстом. Форма яе кроны — трохвугольнік — сімвал Святой Тройцы. Па старажытнай традыцыі, на верхавіну ялінкі ўзнімаюць Віфлеемскую зорку. Свечкі ці лямпачкі — гэта святло новага жыцця. Арэшкі вешаюцца на ёлку як сімвал крэпасці духу хрысціян, а прысмакі — сімвал дабрыні. У верхняй частцы ёлкі развешваюцца анёлы, а ў сярэдняй і ніжняй — птушкі і звяры, якія радуюцца Калядам.

Вечар напярэдадні Каляд, Куцця, мае асаблівае значэнне. У гэты дзень неабходна выконваць строгі пост. Лепш наогул нічога не есці да першай зоркі (яна сімвалізуе Віфлеемскую).

— Першыя і апошнія дні посту патрабуюць вялікай увагі, — кажа Аляксандр Пальчэўскі. — Выключаюцца мяса, малочныя прадукты. Застаецца раслінная ежа і гародніна. І толькі непасрэдна ў Калядны дзень накрываецца святочны стол, на якім ёсць мясныя стравы.

Традыцыйная трапеза ў вечар напярэданні Каляд — куцця. Класічная страва гатуецца з зерняў ячменю ці пшаніцы, а падсалоджваюць яе мёдам і сухафруктамі. У нашы дні куццю гатуюць з розных круп — часцей за ўсё з рысу, дадаюць цукаты, мак, арэхі. Кожны за калядным сталом павінен абавязкова з'есці хаця б лыжачку куцці.

ТРАДЫЦЫІ І ЗВЫЧАІ

Галоўны калядны сімвал — прыбраная ёлка. Хоць наогул старажытных калядных традыцый існуе вялікае мноства і ў кожнай мясцовасці яны адрозніваюцца.

— Мы не звязваем жыццё Царквы з гэтымі традыцыямі, але ў той жа час прымаем многія з іх, — кажа суразмоўца. — Напрыклад, на Каляды ёлачку ўпрыгожваюць і ў храмах — як дадатак да святочнага настрою. Але рэлігійнага напаўнення гэтая традыцыя не мае.

Заходнееўрапейскі сімвал Раства — калядны вянок. Ім упрыгожваюць дзверы ці святочны стол. Круг сімвалізуе вечнае жыццё, зеляніна — здароўе і дабрабыт, а свечкі — радасць і будучае шчасце.

І, вядома, падчас Каляд на Беларусі заўсёды калядавалі: дзеці — днём, моладзь — калі ўжо сцямнее. Вясёлыя чародкі хадзілі па дварах, віншавалі суседзяў з Калядамі і збіралі падарункі — прысмакі, а часам і манеткі. Першым ішоў звяздар — ён нёс на тычцы Віфлеемскую зорку, следам — званар са звоначкамі, былі сярод калядоўнікаў і «звяры»: «каза» сімвалізавала дастатак і багацце, «мядзведзь» — сілу і здароўе. Замыкаў працэсію механоша — ён нёс мяшок, куды складваліся дары.

Калядная батлейка, старажытны лялечны тэатр — яшчэ адна неад'емная частка народнай традыцыі сустрэчы Каляд на Беларусі. На маленькай сцэне перад гледачамі лялькі разыгрывалі фрагменты з Новага Запавету, звязаныя з Раством Хрыстовым. Класічная канструкцыя батлейкі трохпавярховая. У верхняй частцы — Віфлеемская пячора: Нованароджаны Ісус у яслях, над ім схіліліся Багародзіца і Іосіф, наводдаль — вол, ослік, авечкі. Дзеянне адбывалася ў сярэдняй частцы фанернай скрыні, а ў ніжняй знаходзілася пекла, куды і падаў у канцы цар Ірад.

ЯК СВЯТКАВАЦЬ ПРАВІЛЬНА?

Каляды заўсёды былі часам дабрачыннасці. Бо вешчуны прынеслі Нованароджанаму Ісусу дары. Адсюль жа, дарэчы, традыцыя рабіць падарункі родным і блізкім.

— Хрысціяне ва ўсе дні закліканы здзяйсняць добрыя ўчынкі, але Каляды — асаблівая нагода. Гэта выдатны час, каб дапамагчы тым, хто больш за іншых мае патрэбу ў дапамозе. Ёсць традыцыя запрашаць дадому на калядную трапезу адзінокіх пажылых людзей, інвалідаў, наведваць з падарункамі дзіцячыя дамы.

— Як не страціць за знешняй «бліскучай мішурой» глыбокі сэнс, закладзены ў гэтае свята?

— Усё проста: на першым месцы ў Каляды (як і ў любое хрысціянскае свята) павінна быць наведванне храма, богаслужэнне. Без богаслужэнняў, якія апісваюць гэтую евангельскую падзею, мы не можам адчуць усю яе прыгажосць сэрцам і на духоўным узроўні. Калядныя богаслужэнні складзены айцамі царквы многія сотні гадоў таму і іх канон усе гэтыя гады не мяняюся. Ужо цяпер у ход богаслужэнняў дадаюцца калядныя тэксты, і прыхаджане выходзяць з храма з адчуваннем свята.

І, вядома, святкаваць трэба правільна: дакладна не лежачы на канапе і гледзячы ў тэлевізар. Не варта і сядзець гадзінамі за сталом з маянэзнымі салатамі і алкаголем.

— Мы маем запаведзь шанавання нядзельных і святочных дзён: шэсць дзён рабі, сёмы — Госпаду Богу твайму. Святочныя дні важна прысвяціць Богу і блізкім, сваёй сям'і, дзецям. Заняцца дабрачыннасцю ці самаадукацыяй. Вы здзівіцеся, наколькі адчуеце сябе як пасля адпачынку і поўнымі сіл пасля правільна праведзеных святочных дзён! Запаведзі дадзены нам Богам як найлепшы спосаб уладкавання міру і свайго жыцця. Калі выконваць іх, наша жыццё будзе рабіцца лепшым.

Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.

«МАЛА ХТО ВЕДАЕ, ЯКІ ЖЫЦЦЁВЫ ШЛЯХ Я ПРАЙШЛА»

(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар. «СГ».)

З лістапада я стала вядучай тэлепраграмы «У людзях» на РТР-Беларусь. Тут у мяне зусім іншае амплуа — я інтэрв'юер. Да мяне прыходзяць знакамітыя людзі краіны. Пэўная інфармацыя, канешне, пра іх маецца ў адкрытых крыніцах. Як правіла, гэта людзі вядомыя сваёй прафесіяй, і таму іншы бок іх жыцця часам паказаць вельмі няпроста. Гэта як пра мяне калісьці казалі, што я «многастаночніца»: і шматдзетная маці, і жонка афіцэра, і тэлевядучая, але гэта зусім не замінае быць яшчэ і памочнікам дэпутата, і весці навуковую дзейнасць — усё гарманічна спалучаецца.

На мой погляд, я не нейкае там выключэнне з правілаў, у Беларусі вельмі шмат жанчын, якія спалучаюць не менш, а значна больш. Гэта цудоўна, што ў нашай краіне ёсць магчымасць жанчыне быць і мамай, і рэалізоўваць сябе прафесійна, быць каханай жонкай і займацца грамадскай дзейнасцю.

Часта, вядома, сутак не хапае, хоць справа не ў часе, а хутчэй у сіле. Дадатковымі справамі можна займацца ў начны час, таму васьмігадзінны начны сон — гэта мая мара, бо паўнавартасна выспацца не атрымліваецца *(усміхаецца)*.

ЧЭРПАЮ СІЛЫ АД ІХ

— Мой дзень пачынаецца з кубка кавы, а перад гэтым — з пад'ёму дзяцей, якіх абавязкова трэба абняць і пацалаваць. Затым я ці муж вязём малых у школу і садок, а далей ужо кожны па сваіх справах.

Адпачываем з сям'ёй часцей за ўсё актыўна. Стараемся катацца на роварах, у зімовы час — гульня ў снежкі, катанне на санках, то-бок для нас важна пабыць разам. Неабавязкова нават выязджаць кудысьці ў забаўляльныя цэнтры, хоць, вядома, і не без гэтага, але ў асноўным бавім час дома. Можам пачытаць кнігі, а можам паглядзець усёй сям'ёй мульцік ці фільм, пагуляць у развіццёвыя гульні. Бывае, у дзяцей з'яўляецца новае захапленне, і яны хочуць, каб мы для іх выдзелілі час, зрабілі разам што-небудзь ці пазбіралі пазлы. Душэўна я перазагружаюся і чэрпаю сілы ад іх, вельмі радуе тактыльны кантакт.

«Сям'я — гэта няпроста. Лічу, што гэта вялізная праца дваіх. Калі чагосьці будзе жадаць толькі адзін, то наўрад ці атрымаецца жыць шчасліва. Трэба ўзаемадзейнічаць».

Маёй старэйшай дачцэ Ганне 12 гадоў, яна вучыцца ў школе. З 1 да 5 класа займалася тхэквандо, плаваннем, а праз пандэмію прыйшлося адмовіцца ад спорту. Пачала сябе шукаць, цяпер захапілася маляваннем, цікавіцца інфарматыкай, дадаткова гэтым займаецца. Сярэдняй, Алісе, у лютым споўніцца сем, яна творчая натура: хутка вучыць вершы, захапляецца танцамі, вельмі актыўная. Яраславу будзе шэсць. Сынок займаецца шахматамі і плаваннем. Аліса і Яраслаў ходзяць у дзіцячы садок. Дарэчы, сын просіць запісаць яго на барацьбу, але пакуль ён маленькі, трэба пачакаць.

ЛЕПШАЙ КРАІНЫ НЯМА

— Адкуль мой патрыятызм? Мы родам з Брэстчыны. Мой бацька Анатоль — афіцэр, два мае дзядзькі таксама ваенныя. Дзяцінства праходзіла на палігоне, дзе служыў дзядзька Юрый, які быў начальнікам 230-га агульнавайсковага Абуз-Лясноўскага палігона. Я туды прыязджала і знаёмілася з ваеннай справай, калі так можна сказаць *(смяецца)*. Таму ўсё гэта я бачыла на свае вочы, знутры. Другі дзядзька, Канстанцін, палкоўнік, быў начальнікам Валькоўскага гарнізона, дарэчы, ён жа навучыў мяне плаваць. Ён з маёй цёткай жылі ў ваенным гарадку і таму пасля палігона ад аднаго дзядзькі я ехала ў ваенны гарадок *(усміхаецца)*, дзе цётка — настаўніца, а дзядзька — афіцэр. І, вядома, там жылі ўсе ваенныя сем'і, стасункі былі з дзецьмі з гэтых сем'яў. Многае адбывалася строга па раскладзе *(смяецца)*. Натуральна, што з дзяцінства закладваліся пэўныя моманты.

А што датычыцца патрыятызму, мой бацька заўсёды шмат ездзіў падчас службы па Беларусі і, калі атрымлівалася, браў мяне з сабой. Ён цікава расказваў пра пэўны горад, у якім мы знаходзіліся, заўсёды стараўся адвесці мяне да гістарычнага месца, калі такое было, тлумачыў назвы вуліц, па якіх нам прыходзілася ездзіць.

У 90-я многія з'язджалі шукаць шчасця за мяжу, я ж ад сваіх бацькоў ніколі не чула такіх размоў, нават думак не было. Жылі і працавалі на гэтай зямлі і іх бацькі. Таму гэта наша краіна і наша радзіма, як бы гэта банальна ні гучала. Паглядзець свет можна, я шмат дзе пабывала і заўсёды вярталася на радзіму — для мяне лепшай краіны няма. Мы — грамадзяне Беларусі, мы тут нечага вартыя, у нас ёсць грамадзянства, правы і, вядома ж, абавязкі. У нас вельмі добра развітая сацыяльная абарона, чаго не хапае ў іншых краінах. Цудоўна, калі ты атрымліваеш тут адукацыю, рэалізоўваешся і потым можаш прынесці карысць дзяржаве — перш за ўсё, сваім людзям, а не чужынцам. Так мы і павінны выхоўваць уласных дзяцей, так выхоўвалі і мяне. Памятаю, бацька мне казаў: «Юля, вучыся!» Я адвучылася ў школе на выдатна, пасля маёй задачай было паступіць ва ўніверсітэт на бюджэт, я паступіла, затым была магістратура, цяпер вось вучуся ў аспірантуры. Аднак для гэтага я прыклала шмат намаганняў.

БРАЦЬ СЯБЕ Ў РУКІ І ВЫРАШАЦЬ ПЫТАННЕ

— Я заўсёды ўдзельнічала ў дабрачынных праграмах. У 2015 годзе ў мяне нарадзілася дачка з дыягназам «фенілкетанурыя». Гэта захворванне звязана з парушэннем абмену рэчываў, калі неабходна ўжываць нізкабялковыя прадукты са спецыяльнай амінакіслотнай сумессю. Прыйшлося мабілізаваць высілкі бацькоў дзяцей з такой генетычнай хваробай і разам вырашаць пытанні.

Напачатку было цяжка даставаць такія прадукты, трэба было заказваць іх за мяжой, а ў той час змяніліся патрабаванні ўвозу, павысіліся мытныя пошліны. Таму з'явілася шмат праблем. Паўстала пытанне аб сацыяльным кошыку неабходных прадуктаў для дзяцей з фенілкетанурыяй. У нашым заканадаўстве з дадзенай катэгорыяй людзей былі пэўныя недахопы, іх неабходна было ліквідаваць. І вось дзякуючы Акадэміі навук, Цэнтру па харчаванні, а таксама інстытуту мяса-малочнай прамысловасці, нашаму грамадскаму аб'яднанню «Будучыня без межаў», вядома, бацькам дзяцей з фенілкетанурыяй, а таксама падтрымцы дэпутатаў парламента і Беларускага саюза жанчын патрэбны прадуктовы набор быў распрацаваны. І на сёння сацыяльны кошык сфарміраваны, то-бок сацыяльная гарантыя ад дзяржавы існуе — ежа для нашых дзяцей ёсць. Вядома, калі хочаш нешта дадатковае, напрыклад, імпартнае, калі ласка — аднак асноўным і неабходным наборам дзеткі забяспечаны.

Вельмі важна не сварыцца з дзяржструктурамі, а падыходзіць рацыянальна да пытання, браць сябе ў рукі і ісці вырашаць пытанне. Данесці людзям, якія валодаюць пэўнымі кампетэнцыямі, што вы прыйшлі не скандаліць, не нагрузіць дадатковай работай чалавека, а хочаце вырашыць праблему свайго дзіцяці. Не трэба сядзець дома на канапе, плакаць, біць сябе ў грудзі і сварыцца — ад гэтага лепш нікому не стане.

ВОСЕМ КУРАЧАК І ПЕЎНІК...

— Мы жывём ва ўласным доме, і ў нас ёсць невялікая гаспадарка — восем курачак і пеўнік *(смяецца)*, якіх трэба не толькі накарміць, але і прыбраць за імі, вадзічкі наліць. Я далікатная, можа, толькі знешне *(смяецца)*. У маіх бабуль заўсёды была гаспадарка: і куры, і козы, і свінні, і трусы, і нутрыі, і каго толькі не трымалі. І агароды былі, і бульбу садзілі, якую я дапамагала палоць. Ды і ў школе мы ездзілі на бульбу, буракі, і гэта было нармальна. Для чалавека такое натуральна — фізічная праца абавязкова павінна прысутнічаць у жыцці. У летні перыяд у мяне ёсць невялікі агародзік, вельмі прыемна пасля есці сваю зеляніну, памідоры, агуркі, гарбузы, кабачкі, бульбу. Цудоўна, калі можна ўбачыць плён сваёй працы.

«Калі ўвесь час песціць дзяцей, будзеш пажынаць такія плады, што мала не падасца. Хапае прыкладаў, калі дзеці адмаўляюцца ад сваіх бацькоў».

Дзеці, безумоўна, дапамагаюць. Яны ўключаны ў гэты абсалютна натуральны працэс па меры сваіх магчымасцяў. Мы ім аддаём увагу, клопат, а яны робяць свой маленькі ўнёсак.

Памятаю, калі мне было 20 гадоў, па студэнцкай праграме я працавала няняй у Амерыцы — запомнілася многае. Для мяне гэта быў вялікі стрэс. У сям'і трое дзетак. Дзівілася ўсяму: там не гатавалі, ежа — толькі ў выглядзе фаст-фуду. Бацькі не ўдзялялі дзецям увагі. Малыя нічога не выконвалі па доме, нават не былі прывучаны прыбіраць за сабой цацкі. Карацей, зусім іншае выхаванне — для мяне такое непрымальна і незразумела.

Лічу, няправільна адгароджваць дзяцей ад дарослых турбот. А вось ад гаджэтаў стараемся дзяцей адвучаць. У старэйшай дачкі кнопачны тэлефон. Раней быў смартфон, але я заўважыла, што ён перашкаджае ёй засяродзіцца, замінае вучобе. Мой тэлефон дзеці ўвогуле не бяруць, толькі могуць папрасіць штосьці сфатаграфаваць. Міма іх навукова-тэхнічны працэс не праходзіць дакладна, усё гэта яны разумеюць, аднак не злоўжываюць. У меншых дзетак увогуле няма гаджэтаў: каб паглядзець мульцікі, у нас ёсць тэлевізар. На жаль, часта мы, дарослыя, самі з'яўляемся творцамі псіхічнага стану нашых дзяцей. Таму бацькам важна выбраць правільную стратэгію паводзін і, галоўнае, растлумачыць дзіцяці, для чаго неабходны тыя ці іншыя абмежаванні.

НАВЕДВАННЕ ХРАМАЎ І КУПАННЕ Ў КУПЕЛІ

— Адна з нашых любімых сямейных традыцый, у якой я таксама чэрпаю сілы, — наведванне храмаў і купанне ў купелі. Калі дрэнна на душы, збіраемся і едзем да крыніцы. Неяк былі ў Жыровічах, у Трафімавай крыніцы акуналіся. Аднак нам пашанцавала: крыніца ёсць недалёка ад нашага дома. Яшчэ адна традыцыя — сямейныя святы, якія мы святкуем заўсёды разам, па магчымасці прыязджаюць нашы бацькі. Любім, калі на святочным стале ёсць беларускія стравы: бульба са смажаным салам, запечанае мяса, традыцыйныя салаты.

«На жаль, часта мы, дарослыя, самі з'яўляемся творцамі псіхічнага стану нашых дзяцей. Таму бацькам важна выбраць правільную стратэгію паводзін і, галоўнае, растлумачыць дзіцяці, для чаго неабходны тыя ці іншыя абмежаванні».

Калі казаць пра адносіны ў сям'і, то ў мяне цудоўны муж — мужчына з вялікай літары, які бярэ на сябе адказнасць за сям'ю, за дзяцей, за мяне. Гэта чалавек, які падзяляе са мной, напэўна, усе абавязкі па доме. Ён ніколі не будзе сядзець на канапе і чакаць, калі яму хто-небудзь прынясе што-небудзь на сподачку. Калі ёсць магчымасць, ён праводзіць час з дзецьмі, робіць з імі ўрокі. У нас усё гарманічна. Мы з паўпозірку разумеем, што сёння правярае ўрокі, хто будзе выконваць пэўную работу *(смяецца)*. Усё, што ён можа даць як мужчына, перадае сыну. З дзяўчынкамі, вядома, крыху іншыя адносіны. Ён афіцэр, я дачка афіцэра, таму, зразумела, у нас было строгае выхаванне. І калі ўвесь час песціць дзяцей, будзеш пажынаць такія плады, што мала не падасца. Хапае прыкладаў, калі дзеці адмаўляюцца ад сваіх бацькоў. Таму, мне здаецца, бацькі павінны ўсё гарманічна спалучаць: і любоў, і строгасць, і клопат, а дзесьці і папесціць можна.

Сям'я — гэта няпроста. Лічу, што гэта вялізная праца дваіх. Калі чагосьці будзе жадаць толькі адзін, то наўрад ці атрымаецца жыць шчасліва. Трэба ўзаемадзейнічаць, гаварыць пра пэўныя моманты, якія турбуюць, бо мы ж прыходзім усе з розных сем'яў. Таму для сямейнага шчасця неабходна каханне, узаемаразуменне і пастаянная праца над сабой, адно над адным.

Хачу пажадаць усім, каб кожны нёс пазітыў, хоць часам цяжка: усе мы людзі. Па сабе ведаю: калі ты добра ставішся да таго, што робіш, то неяк усё складваецца і атрымліваецца. Многія бачаць мяне, быццам прыгожую абгортку, але мала хто ведае, які жыццёвы шлях я прайшла. Трэба жыць не з пазіцыі, што ўсе табе павінны. Важна задаць сабе пытанне: а што я зрабіў для іншых, для краіны, каб было добра не толькі табе, але і іншым? І верыць у сябе, умець аддаваць, а не толькі атрымліваць. І тады ўсё будзе цудоўна. А яшчэ я для сябе зразумела, што не трэба баяцца гаварыць аб нейкай праблеме. І калі ты хочаш яе вырашыць, то знойдуцца людзі альбо так складзецца сітуацыя, што гэта ўдасца ажыццявіць.

Надзея ЗУЕВА.
Фота з сямейнага архіва гераіні.

ПЕРШАЕ ПРАЦОЎНАЕ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)

Працягласць штодзённай змены непаўналетніх падчас канікул і вучэбнага года таксама адрозніваецца. На канікулах дзеці ва ўзросце ад 14 да 16 гадоў могуць працаваць не больш за 4 гадзіны і 36 хвілін, а вось ва ўзросце ад 16 да 18 гадоў — 7 гадзін. Падчас вучэбнага года дзеці ва ўзросце ад 14 гадоў могуць працаваць увогуле не больш за 2 гадзіны 18 хвілін, а ўжо з 16 гадоў — не больш за 3 гадзіны 30 хвілін.

ЦІ ЛЁГКА ЯЕ ЗНАЙСЦІ

На пошукі працы для двух падлеткаў 14 і 17 гадоў я накіравалася на Берасцянскую, 20 у Мінску, у аддзел абслугоўвання грамадзян Камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне насельніцтва Мінгарвыканкама. Выклаўшы сваю просьбу, атрымала ўнушальны спіс работадаўцаў. Патэлефанаваўшы 10 найманьнікам, якім патрабаваліся працаўнікі, даведалася, што насамрэч не ўсе яны гатовыя браць падлеткаў у штат. Але былі і работадаўцы, гатовыя запрасіць падлеткаў на сумоўе. Так, у ТАА «Чыстыя крыніцы» (гандлёвая сетка «Суседзі») спецыяліст па найме расказаў, што ў іх працуе шмат непаўналетніх, але толькі з 16 гадоў. Непаўналетнім прапануюць пасаду накшталт «памочнік прадаўца». Плацяць ад 4 рублёў да 4,60 за гадзіну. Але прапанавалі крыху пачакаць і пераэлефанаваць праз пару месяцаў: маўляў, тады можа вызваліцца вакансія.

Датэлефанавалася і ў ЗАТ «Інтэрнэт-крама Еўраопт». Там для маладых людзей прапануюць работу кур'ерам па дастаўцы прадуктаў харчавання. Аплата здзельная: за гадзіну плацяць 1,50 рубля і дадаюць тры рублі за дастаўлены заказ. Аплата робіцца штотыднёва па выніках дастаўленых заказаў. Умовы няпростыя: сумка з заказам можа важыць да 15 кг. Можна выкарыстоўваць ровары або самакаты, пра якія клапоціцца работадаўца. Найлепшыя ўмовы, на мой погляд, прапанавалі ў «Макдональдсе», дзе аказалася пару вольных вакансій для непаўналетніх. Пасада «работнік рэстарана» мае на ўвазе камплектацыю заказу для гасцей. Аплата за такую працу — 5 рублёў 40 капеек у гадзіну плюс 77 капеек — даплата для непаўналетніх. Акрамя таго, змена ў падлеткаў будзе заканчвацца не пазней за 21:30.

Аказалася, знайсці працу і афіцыйна ўладкавацца зімой магчыма толькі падлеткам, старэйшым за 16 гадоў. Для дзяцей з 14 да 16 гадоў вакансіі знайсці не ўдалося.

Мне параілі звярнуцца з гэтым пытаннем у школу, бо звычайна такіх «маладзенькіх» набіраюць у спецыяльныя працоўныя брыгады пры гэтай навучальнай установе і толькі з дазволу бацькоў.

— Калі казаць пра другасную занятасць для падлеткаў з 14 гадоў, то звычайна дзяцей не задзейнічаюць у зімовы перыяд, — кажа **дырэктар сярэдняй школы № 67 горада Мінска Таццяна КАВАЛЕНЯ**. — Праца часцей звязана з дапамогай па добраўпарадкаванні тэрыторыі, і таму школьнікі працуюць з красавіка да кастрычніка. Калі дажджліва, тады нашы маладыя працаўнікі робяць нешта ў памяшканні. З дзецьмі ўсё гэтак жа сур'ёзна, як і з дарослымі. З імі праводзяцца інструктажы, яны, як і дарослыя, атрымліваюць разліковыя лісткі, мы ім заводзім працоўныя кніжкі.

Увесну ў школах звычайна праводзяць апытанне і такім чынам выяўляюць дзяцей, якія хацелі б падзарабіць. Набіраюць у брыгаду, якая працуе на базе школы, а таксама ў атрады ад БРСМ, праўда, апошнія працуюць на іншых аб'ектах, а не ў школе.

Дарэчы, ахвотных падпрацаваць даволі шмат. Так, увесну і ўвосень у гэтай школе працавала брыгада з дзесяці падлеткаў. Дырэктар пераканана, што праца ў гэтым узросце вельмі карысная для моладзі, да таго ж, падлеткі могуць зарабіць нядрэнныя грошы. Так, сёлета у сярэднім заробак школьнікаў складаў ад 100 да 200 рублёў у месяц.

ЦАНА НЕЗАЛЕЖНАСЦІ

Калі Аляксандры было 15 гадоў, яна вельмі хацела знайсці працу. Праз інтэрнэт шукала аб'явы аб вакансіях і тэлефанавала. У адказ чула пажаданне добра вучыцца і падрасці. Дзяўчына амаль зусім страціла надзею, але аднойчы сяброўка расказала ёй аб нейкай «таямнічай кавярні», дзе бяруць на падпрацоўку нават 15-гадовых, але неафіцыйна. Звычайна за дзень там можна было зарабіць да 30 рублёў. Сяброўка Аляксандры сама там перыядычна падзарабляла, так што месца здавалася надзейным. Праца аказалася нерэгулярная: моладзь бралі, толькі калі ў кавярні намячаўся банкет. Сяброўка паабяцала патэлефанаваць у такі дзень. Гэта адбылося неўзабаве. Аляксандра паехала на працу ў 16:00. Там перад банкетам яна націрала посуд да бляску, а падчас банкета збірала са сталоў брудны посуд і прыносіла чысты. Пасля мерапрыемства падлеткі засталіся прыбіраць. Дадому Аляксандра вярнулася каля 12 ночы з трыццаццю рублямі ў кішэні.

— Я тады была вельмі шчаслівая, — узгадвае Аляксандра. — Здавалася, што цяпер маё жыццё будзе іншым, больш не трэба клянчыць у мамы на паход у кіно, я спакойна магу зайсці ў кафэ і купіць сабе каву.

Аляксандра за дзень патраціла ўсе грошы і з нецярпеннем чакала наступнага запрашэння папрацаваць.

Неўзабаве на працы здарылася надзвычайнае: дзяўчына выпусціла з рук бакал, ён разбіўся. Яна не раз бачыла, як адміністратар сварыцца на падлеткаў, але спадзявалася гэтага пазбегнуць. Не выйшла. Дзяўчына памятае, як стала спешна збіраць асколкі ў рукі і парэзалася. У секунды каля яе аказалася адміністратар і злосна загадала сысці з залы. Потым былі і крыкі, і абразы, але Аляксандра ўсё сцярпела.

— Гэта адчуванне бездапаможнасці і нейкага страху проста не забыць, — успамінае дзяўчына. — Мама тады мяне суцяшала, казала, што такое здараецца з усімі, і прасіла не хадзіць на гэтую працу. Але мне хацелася самастойнасці.

Цяпер Аляксандры 17 і яна працуе ў адной са сталічных кавярань памочнікам барыста. У яе абавязкі ўваходзіць прыносіць гасцям заказ, прыбіраць, ведаць склад страў, якія падаюць гасцям. За працу дзяўчыне плацяць 5 рублёў за гадзіну і разлічваюцца штодня. Ніякіх штрафаў і крыкаў, усе ставяцца адзін да аднаго з павагай. Працуе Аляксандра ў дзень не больш за 6–7 гадзін — за гэтым строга сочыць работадаўца.

16-гадовы Дзіма ўладкаваўся на працу ў адзін з рэстаранаў хуткага харчавання. Дома ў яго не ладзіліся адносіны з бацькамі, таму хлопцу хацелася менш з імі сутыкацца.

— Я працую ўжо паўгода, і калі шчыра, то мне не вельмі падабаецца, — гаворыць малады чалавек. — Я ад прыроды вельмі кампанейскі, а мяне ставяць паніраваць курыцу... у адзіноце. Уяўляеце, сем гадзін свярліць вачыма сцяну, паніраваць курыцу і ні з кім не размаўляць?

Плацяць за гэтую працу 3 рублі 90 капеек за гадзіну. У месяц хлопцу аднойчы ўдалося зарабіць 450 рублёў. Сам Дзіма не лічыць гэты заробак вялікім — ён платна вучыцца ў каледжы і ведае цану грашам. Упэўнены, што не можа дазволіць сабе не працаваць.

— Ведаеце, ёсць у працы і плюсы, — прызнаецца Дзіма. — Калі яшчэ не працаваў, то ўвесь час перажываў з-за любой дробязі, а зараз не... Пасталеў. Няма сіл на глупства! З вучобы на працу, з працы дадому — вучыцца. Так вось і жыву.

Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.

Бяспека ў доме

ВЕСЕЛА І БЕЗ НАСТУПСТВАЎ

Адны з нашых самых любімых свят — Новы год і Каляды, якія нясуць чараўніцтва і казку. Усе імкнуцца падрыхтаваць адно аднаму падарункі, стварыць святочную абстаноўку ў доме, прыбраць прыгажуню ёлку. Звычайна навагоднія святы не абыходзяцца без феерверкаў, хлапушак, бенгальскіх агнёў і г. д. Сёння ўсе піратэхнічныя вырабы можна набыць у спецыялізаваных крамах. Аднак, каб свята прайшло весела і без здарэнняў, трэба выконваць правілы бяспекі.

Штогод, у самы разгар гулянняў, па медыцынскую дапамогу звяртаецца немалая колькасць людзей з рознымі траўмамі, апёкамі і г. д. Сумна для некаторых грамадзян скончыліся забавы і падчас мінулых навагодніх свят.

Вечарам 7 студзеня 2021 года па ўрачэбную дапамогу ў г. Гомелі звярнуўся мужчына, які атрымаў траўму пры неасцярожным абыходжанні з петардай. Пасля агляду ўрачом хуткай медыцынскай дапамогі з папярэднім дыягназам траўматычная ампутацыя фаланг пяці пальцаў правай кісці ён быў шпіталізаваны ў Гомельскую гарадскую клінічную бальніцу № 1.

Каб не апынуцца на бальнічным ложку, перад выкарыстаннем вырабу неабходна ўважліва вывучыць інструкцыю. Любая піратэхніка павінна быць заводскай вытворчасці, у заводскай упакоўцы і сертыфікавана. Звярніце ўвагу на тэрмін прыдатнасці. Калі феерверк, петарда не спрацавалі адразу, то запускаць іх паўторна не варта, а падыходзіць да піратэхнічнага вырабу можна не раней, чым праз 15 хвілін. Запускаць піратэхніку павінны толькі дарослыя, ні ў якім разе нельга гэта рабіць дзецям, а таксама ў месцах збірання вялікай колькасці людзей, паблізу газаправода, дрэў, лініі электрапередачы, на аўтазапраўках. Не насіце піратэхніку ў кішэнях ці пад адзеннем і не курыце падчас работы з ёй. Нельга разбіраць піратэхнічныя вырабы і дапускаць, каб гэта рабілі дзеці. На жаль, дастаткова выпадкаў, калі траўмы ад

піратэхнікі атрымліваюць менавіта яны.

Многія лічаць, што бяскрыўдная гірлянда на ёлцы не можа прычыніць асаблівай шкоды. Аднак і гірлянда часам становіцца прычынай пажару. Нельга пакідаць уключаную гірлянду без нагляду і выкарыстоўваць, калі на ёй ёсць якія-небудзь пашкоджанні.

Раніцай 1 студзеня 2021 года ратавальнікам г. Оршы паступіла паведамленне аб задымленні ў пад'ездзе аднаго з пяціпавярховых дамоў. Як аказалася, агонь узгарання знаходзіўся ў адной з кватэр на чацвёртым паверсе. У задымленым пакоі на ложку быў знойдзены мужчына, якога ратавальнікі перадалі брыгадзе хуткай дапамогі. Гаспадара кватэры шпіталізавалі з атручэннем прадуктамі гарэння і апёкам верхніх дыхальных шляхоў. Версія прычыны пажару — кароткае замыканне гірлянды на ёлцы.

Навагоднее свята магло скончыцца яшчэ больш трагічна. У падобным выпадку выявіць узгаранне на ранняй стадыі заўсёды дапаможа аўтаномны пажарны апавяшчальнік (АПА). Рэкамендуецца ўстанавіць АПА ў жылых пакоях. Пры задымленні апавяшчальнік адрэагуе звонкім сігналам, які разбудзіць не толькі гаспадароў кватэры, але і суседзяў. Дзякуючы аўтаномнаму пажарнаму апавяшчальніку выратавана нямала чалавечых жыццяў.

Ратавальнікі віншуюць усіх грамадзян з Калядамі і Новым годам і жадаюць правесці святы весела, цікава і без надзвычайных сітуацый!

Марына ВАСІЛЕЎСКАЯ, галоўны спецыяліст Рэспубліканскага цэнтра прапаганды МНС.

ЯК ДЗЕД МАРОЗ ЗАБЫЎ БАРАДУ

І іншыя навагоднія прыгоды з жыцця чараўніка

Вашы дзеці ўжо напісалі ліст Дзеду Марозу? Калі не, то самы час гэта зрабіць. Можна адправіць яго на адрас Белавежскай пушчы. Альбо проста пакласці ў маразілку (ліст адтуль забяруць гномы, калі адчынена фортка і ніхто не бачыць). Мы ж з сынам ужо другі год запар адносім ліст навагодняму чараўніку ў лес. А сёлета ўпершыню вырашылі запрасіць дзядулю дадому. Пакуль шукала прымальны варыянт, даведалася, што Дзед Мароз, аказваецца, прыходзіць не толькі да дзяцей...

ЗАРУЧАЛЬНЫ ПЯРСЦЁНАК ПАД БОЙ КУРАНТАЎ

Летась, напрыклад, адзін малады чалавек зрабіў прапанову рукі і сэрца каханай з дапамогай Дзеда Мароза.

— Я прыйшоў проста ў навагоднюю ноч і пад бой курантаў уручыў нявесце пярсцёнак, — распавядае Дзед Мароз са стажам Алег Драздоў. — Было відаць, што дзяўчына не чакала такога сюрпрызу. Расплакалася ад шчасця. Гэта было так міла.

— Муж часта паўтарае: «Я ўжо не ведаю, каго ўва мне больш: Алега Драздова ці Дзеда Мароза», — смяецца Алеся Драздова. — Я ж у ім больш люблю Дзеда Мароза. Магчыма, таму што калісьці закахалася ў Алега менавіта ў гэтай ролі.

Алеся сустрэла свайго Дзеда Мароза 19 гадоў таму пад Новы год — жанчына, якая працавала Снягуркай, шукала сабе падмену на выпадак накладак.

— А я, студэнтка, была не супраць такой падпрацоўкі, — кажа Алеся Драздова. — Вось тая жанчына і ўзяла мяне да сябе. Разам з ёй працаваў Дзедам Марозам мой будучы муж Алег. Яна нас і пазнаёміла. Мы некалькі разоў папрацавалі ў пары. На той час не здарыўся ніякі раман. Але праз год мы сустрэліся на дні нараджэння ў агульных знаёмых і неяк усё закруцілася.

Дзед Мароз і Снягурка жаніліся. Неўзабаве бізнес, якім займаўся Алег, закрыўся. Сталі думаць, як зарабляць на жыццё. Вось з тых часоў і займаюцца арганізацыяй свят.

У Алега і Алесі Драздовых трое дзяцей. Калі яны хадзілі ў дзіцячы садок, тата заўсёды прыходзіў да іх на ранішнікі ў ролі Дзеда Мароза. Прычым для гэтых мэт у яго быў адмысловы касцюм.

— Дзеці ведалі, што тата працуе памочнікам Дзеда Мароза, бачылі яго звычайна ў чырвоным футры, — тлумачыць Алеся. — У садок жа Алег хадзіў у іншым — блакітным.

— Дзеці мяне не пазнавалі, гэта нагода для гонару, — усміхаецца Алег Драздоў. — Пасля ранішнікаў яны прыходзілі дадому і бурна абмяркоўвалі пры мне, які да іх прыходзіў «сапраўдны класны Дзед Мароз». Чым даўжэй у дзяцей застаецца вера ў цуды, тым лепш. Яна потым і па жыцці таксама дапамагае. Наогул, вера — адна з рэчаў, што пакуль і выратоўвае свет.

За столькі гадоў якіх толькі заказаў не было ў Дзядулі Мароза! Напрыклад, тата сышоў з сям'і. Мама жыве з іншым мужчынам і не дазваляе былому мужу бачыцца з дзецьмі, нават на парог не пускае. І вось тата прыдумаў выйсце: заказвае Дзеда Мароза, каб той даставіў малым падарункі.

— У нас было некалькі такіх заказаў. Але найбольш уразіў леташні выпадак. Мужчына прывёз столькі падарункаў, што ў калідоры не засталося вольнага месца, — распавядае Алеся Драздова. — Усе яны былі клапатліва запакаваныя і падпісаныя. Мы, вядома, не глядзелі, што было ў каробках. Але ў мяне і цяпер перад вачыма стаіць той калідор, застаўлены падарункамі, — гэта так кранальна, да слёз.

— Мы прыходзім у розныя сем'і, — дадае Алег Драздоў. — Здараецца, што дзеці просяць Дзеда Мароза зусім не пра дзіцячыя рэчы. Ніколі не забудуся, як хлопчык шаптаў мне на вуха просьбу, каб тата кінуў піць.

Не абышлося і без камічных сітуацый. Аднойчы Дзед Мароз забыўся сваю бараду ў дзіцячым садку. Адпрацаваў на навагоднім ранішніку, пераапрануўся і паехаў на дарослы карпаратыў. Прыехаў

у рэстаран, а барады няма. Тэлефанаваць у садок было позна: усе разышліся па дамах. Ну, што рабіць, выйшаў без барады і сказаў: «Спонсар сённяшняга вечара фірма «Джилетт — лучше для мужчины нет». Публіка адрэагавала гучным смехам і апладысментамі.

ТЫГРАНЯ ЗАМЕСТ СНЯГУРКІ

Выпрабаванне на знаходлівасць, звязанае з барадой, было і ў Васіля Дранько-Майсюка. Неяк, яшчэ на пачатку «дзедмарозаўскай кар'еры», яго запрасілі правесці дзіцячы навагодні ранішнік. Касцюм арганізатары паралі не браць. Маўляў, не хвалюйцеся, у нас усё ёсць. І начапілі Васілю на твар гумовую маску Дзеда Мароза.

— У разгар свята мне стала вельмі горача ў гэтай масцы, — згадвае Васіль. — Немагчыма праводзіць свята, бо стаў ужо задыхацца. «Дзеткі, — кажу, — зараз ставім чароўную музыку, пад якую нават Дзядуля Мароз памаладзее». І пачынаю артыстычна здымаць маску. Дзецям спадабалася такое пераўтварэнне. Вось так я сябе выратаваў.

А аднойчы Дзеда Мароза запрасілі ў багаты катэдж у Падмаскоўі (Васіль тады жыў і працаваў у Маскве).

— Адчуваю, нехта мне аб нагу трэцца. Гляджу, а гэта... сапраўднае тыграня, якое бацькі вырашылі падарыць на Новы год свайму малому сыну. Жывёла, як потым высветлілася, пераблытала Дзеда Мароза са сваім папярэднім гаспадаром, які таксама быў сівы. Таму падчас віншавання не адыходзіла ад мяне ні на крок. Я тут жа абыграў гэтую неспадзяванку, і тыграня ў мяне было замест Снягуркі. Мне падабаецца, калі не толькі дзеці ўдзельнічаюць у навагодняй казцы, якую я прыношу з сабой, але і іх бацькі. Напрыклад, сур'ёзнаму тату прапаную пабыць мудрым дубам, а вытанчанай маме — бярозкай.

Васіль, драматург па адукацыі, ладзіць для дзетак сапраўднае тэатралізаванае інтэрактыўнае свята. Прыходзіць віншаваць малых без Снягуркі. Затое ў Васіля з сабой заўсёды пацешны Парсючок. Дзядуля Мароз дастае з мяшка мяккую цацку і знаёміць з дзецьмі, расказвае пра яе вясёлую гісторыю. Напрыканцы ж усе разам шукаюць падарункі.

Падзяліўся Васіль і самымі кранальнымі дзедмарозаўскімі ўспамінамі. «Неяк дзяўчынка заказала ляльку, падобную да таты, бо той надоўга з'язджае ў камандзіроўкі. А хлопчык папрасіў Дзеда Мароза расказаць бабулі, якая памерла, што ён раніцай есць кашу і ўжо амаль вывучыў увесь алфавіт».

Даводзілася Васілю аднойчы быць і нетыповым Дзедам Марозам — у шортах і кепцы. Бо запрасілі яго на «Трапічны Новы год на востраве» — свята з пальмамі бананамі і гарачымі танцамі.

«АДЧЫНЯЮЦЦА ДЗВЕРЫ, А ТАМ МУЖЧЫНА З БЕЙСБОЛЬНАЙ БІТАЙ»

Калі я напісала ў сацсетках, што шукаю Дзеда Мароза, Святога Мікалая ці Зюзю, першым мне адказаў Васіль Грыбоўскі: «Калі ласка, Святы Мікалай».

— Бавіць час не толькі весела, але і з карысцю — мой дэвіз, — кажа Васіль Грыбоўскі. — Я нават строй шыў з пэўнымі сімваламі, каб было адразу відаць, што прыйшоў менавіта беларускі Дзед Мароз. Напрыклад, на маім поясе — выявы шасціканцовых крыжоў накшталт крыжа Ефрасінні Полацкай, старадаўні славянскі сімвал — сонцаварот. Заўжды цікаўлюся ў бацькоў, што ёсць вашыя дзеткі, які ў іх характар, чым захапляюцца. Можа, трэба каго крышачку пажурыць жартаўліва. «Глядзі, будзеш ленавацца матузкі завязваць — я ў наступным годзе прыйду і жабу табе падару». Ці футболам хлопчык займаецца, напрыклад: «Во, кажу, у цябе мячык у кутку. Ты, мабыць, футбаліст. Паспрабуй забіць мне гол».

Калі дачка Васіля Грыбоўскага была зусім маленькая, Святы Мікалай прыходзіў і да яе. Аднойчы малеча выпадкова пабачыла татаў сцэнічны строй і кажа: «У цябе такі ж касцюм, як у Святога Мікалая, які да мяне прыходзіў».

— Мая дачушка, ёй зараз 10 гадоў, верыць у Святога Мікалая. Сказаў, што я проста дапамагаю яму на зямлі. Бо дзетак шмат, і ён адзін не дае рады. Таму ёсць такія служкі ў кожнай краіне.

Неяк Васілю патэлефанавала жанчына і папрасіла павіншаваць мужа з Новым годам, уручыць яму прэзент. Прычым яна хацела, каб той нічога не западозрыў раней часу. Святы Мікалай тады быў не адзін, а з Крампусам (казлападобны спадарожнік Святога Мікалая, які карае непаслухмяных дзяцей).

— Калі мы патэлефанавалі ў дамафон, пачулі мужчынскі голас, — узгадвае Васіль Грыбоўскі. — Каб не выдаць таямніцу, прадставіліся супрацоўнікамі ЖЭСа, маўляў, трэба глянуць трубы. Мужчына нам не адчыніў. А калі паўтарылі спробу, пачулі пагрозу накшталт: яшчэ раз патурбуеце, мала не падасца. А нам жа трэба зайсці яго павіншаваць. Карацей, неяк, дзякуючы добрым людзям, зайшлі мы ў пад'езд. Падымаемся, ціснем на званок... Адчыняюцца дзверы, і мы бачым раз'юшанага дзецюка з бейсбольнай бітай у руках: «Я ж сказаў...» На шчасце, у гэты момант з кватэры выбегла жоначка з тэлефонам і, смеючыся, пачала здымаць усё на відэа. Але нам тады было не да смеху.

«УСЁ СВЯТА ДЗЯДУЛЯ ПРАВЁЎ, ЛЕЖАЧЫ НА ПАДЛОЗЕ»

— Кліенты кажуць, што Дзяды Марозы, якія прыходзяць віншаваць дзетак, абавязкова пытаюцца: «А што ты мне падрыхтаваў?» У нас такога ўвогуле няма, мы не просім расказваць вершык ці спяваць песеньку (калі толькі дзіця моцна жадае, канешне, Дзед Мароз выслухае), — кажа Вераніка Скарб, настаўніца, якая падчас навагодніх свят ператвараецца ў Снягурку. — Стараемся рабіць праграму разнастайнай, якая падыходзіць і для дзяцей, і для дарослых, каб аб'яднаць іх у адно свята. Я вельмі люблю, калі ёсць нейкія «фішкі», фокусы. Мой Дзед Мароз Аляксей, напрыклад, іграе на ўкулеле, на звычайнай гітары. Летась быў незвычайны досвед. Нас запрасілі павіншаваць з Новым годам маленькае дзіця. Дык Дзед Мароз, каб малеча яго прыняла, усё свята ляжаў з ім на падлозе. Гэта было вельмі цікава. Дзіця было ў захапленні.

З задавальненнем Вераніка і Аляксей працуюць з асаблівымі дзеткамі. Напрыклад, ужо не першы год Дзед Мароз і Снягурка прыносяць цуд у сям'ю, дзе хлопчыкі не бачаць. Рыхтуюць для іх тактыльнае віншаванне.

— Калі дзіця асаблівае, то там вельмі шмат увагі патрэбна ўдзяліць бацькам, асабліва маме, — кажа Вераніка.

Настаўніца і аніматарка звычайна пад Новы год ператвараецца ў Снягурку. Але некалькі разоў кліенты прасілі, каб разам з Дзедам Марозам прыйшоў клоўн. А аднойчы Вераніцы давялося працаваць у навагоднюю ноч у лепельскім санаторыі. Паказвала там фокусы ў касцюме Снягуркі.

Неяк, успамінае Вераніка, дзяўчынка падбегла да Дзеда Мароза і запыталася: «Дзядуля Мароз, а які падарунак ты чакаеш на Новы год?»

— Гэта было так кранальна! Калі дзіця падумала не толькі пра сябе. Такая ўвага дарагога вартая. У некаторых сем'ях ёсць традыцыя: Дзед Мароз прыйшоў з падарункамі, і мы таксама яму штосьці падорым. Часцей за ўсё дзеці ўручаюць свае малюнкі, цацкі на елачку, самаробнае печыва, аддаюць лісты, якія напісалі, Дзеду Марозу ў рукі.

* * *

Напрыканцы хачу падзяліцца цёплым успамінам маёй зямлячкі, таленавітай дзіцячай пісьменніцы.

— У студэнцтве на Новы год, — згадвае Алена Масла, аўтарка кнігі «Каляды з хроснай» (якую смела можна класіці дзеткам пад ялінку), — я прыязджала дамоў на Мёршчыну і брала ў школе касцюм Дзеда Мароза. Пераапраналася — і хадзіла віншаваць суседзяў. Пайшла пагудка сярод дзятвы, што ў Мілашове ходзіць сапраўдны Дзед Мароз, і градскія ўнукі штогод прасіліся на вёску — каб яго не прапусціць. Мілашоўскія бабулі і дзядулі былі мне за гэта ўдзячныя, і кінуць свае абавязкі ўжо не выпадала. Пасля традыцыя працаваць Марозам перакінулася на маю маладую сям'ю, пазней падраслі памочнікі — Маразяты... Перагледаю старыя фотаздымкі і разумею, што гэта быў сапраўдны цуд.

Цуды — яны ж так і ствараюцца: сваімі рукамі, ад чалавека да чалавека. Згодныя?

Надзея ДРЫНДРОЖЫК.
Фота з архіва сям'і Дзядулі Мароза Алега ДРАЗДОВА.

КОЛЬКІ КАШТУЕ ЗАПРАСІЦЬ ДЗЕДА МАРОЗА ДАДОМУ?

Цана залежыць ад многіх складнікаў. Па-першае, ад даты. Чым бліжэй да Новага года, тым даражэй. 31-га чысла практычна ўсе Дзяды Марозы працуюць па двайным кошце. Умоўна кажучы, калі 26 снежня — 50 рублёў, то тая ж паслуга 31-га будзе каштаваць 100 рублёў. Па-другое, цана залежыць ад часу сутак. Многія хочуць, каб Дзед Мароз прыйшоў менавіта ноччу. Гэта абыдзецца даражэй, чым раніцай ці днём. Таксама бярэцца пад увагу, наколькі далёка ехаць Дзеду Марозу, колькасць удзельнікаў на святе. Ну і спецыфічныя пажаданні бацькоў, напрыклад каб Дзед Мароз працаваў на вуліцы. Ці, калі гэта прыватны дом, каб ён зайшоў праз акно ці балкон. Ці наогул выйшаў з лесу. Няма такога, што цана адналькавая для ўсіх. Звычайна ўказваецца мінімальная стаўка: ад 50 беларускіх рублёў (за 15-хвіліннае віншаванне) і вышэй. А далей ужо ўлічваюцца індывідуальныя пажаданні кожнага кліента.

ЗАО «БЕЛРЕАЛИЗАЦИЯ» ОБЪЯВЛЯЕТ АУКЦИОН

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 28, тел.: (8017) 298-53-53; (8029) 690 54 09, **BELTORGI.BY**

Продавец: **СООО «Компания Офисный Комфорт»** (УНП 800017250), 223610, Минская обл., г. Слуцк, ул. Стародорожская, 22А, в лице ликвидатора ИП Татарова Василия Сергеевича, тел. +37529 666-71-75.

Повторные публичные торги в электронной форме будут проведены **28 декабря 2021 г. 09.00 до 17.00** на электронной торговой площадке **BELTORGI.BY**.

№ п/п	Предмет торгов	Начальная цена предмета торгов, бел. руб. с НДС
1	Производственное здание, инв. № 640/С-41 пл. 1773,8 кв. м, Минская обл., Слуцкий р-н, г. Слуцк, ул. Стародорожская, 22А; овощехранилище, инв. № 640/С-74 пл. 414,1 кв. м, Минская обл., Слуцкий р-н, г. Слуцк, ул. Стародорожская, 22А/1; здание специализированное энергетики ТП-159, инв. № 640/С-58837 пл. 44,9 кв. м, Минская обл., Слуцкий р-н, г. Слуцк, ул. Максима Богдановича, забор	915 258,24
2	Грузовой автомобиль IVECO DAILY 50С, 2006 г. в., рег. знак АІ 3675-5	16 224,00
3	Легковой автомобиль VOLKSWAGEN CARAVELLE, 2002 г. в., рег. знак 1587 ЕК-5	14 688,00
4	Грузовой автомобиль DAF 55.250, 2006 г. в., рег. знак АІ 9621-5	34 848,00
5	Грузовой автомобиль IVECO DAILY 35С15, 2009 г. в., рег. знак АК 8367-5	23 424,00
6	Грузовой автомобиль CITROEN JUMPER, 2007 г. в., рег. знак АК 0915-5	14 112,00
7	РЕССИВЕР РВ 500,11,00, 2002, инв. № МБП0075	528,00
Сітуацыю пракаментаваў і міністр транспарту і камунікацый Літвы Марус Скуадзіс. Паводле яго слоў, прымаць «безразважныя і імпульсіўныя» рашэнні ў гэтым пытанні недапушчальна. «Я маю на ўвазе магчымыя судовыя працэсы, іх маштаб, і таму мы не можам дазволіць сабе прымаць хуткія, безразважныя і імпульсіўныя рашэнні на дадзеным этапе. Але ёсць факт, што іскі будуць», — працытавала міністра Delfi.

Грузы «Беларуськалія» будуць праходзіць праз Літву да студзеня, заявіла кампанія Lietuvos gelezinkeliai. Паводле яе даных, прадпрыемства грузавых перавозак LTG Cargo, якое ўваходзіць у групу, у снежні павінна перавезці каля 1 млн т угнаенняў. Па дамове з Lietuvos gelezinkeliai беларускі бок ужо загадзя разлічыўся за правоз гэтых грузаў.

Ніякіх санкцый

Транзіт калійных угнаенняў «Беларуськалія» праз Літву не можа быць спынены, паколькі гэта ідзе ўразрэз з міжнароднымі пагадненнямі Літвы, Еўрасаюза і ЗША. Аб гэтым заявіў Ігар Удавіцкі, найбуйнейшы акцыянер тэрмінала Biriu Kroviniu Terminalas у Клайпедзе, што спецыялізуецца на перавалцы беларускіх угнаенняў, паведаміла Delfi. Тэрмінал насыпных грузаў Biriu Kroviniu Terminalas загружае на судны прыблізна 11 мільёнаў тон прадукцыі вытворцы ўгнаенняў «Беларуськалія» на год. Ігар Удавіцкі з'яўляецца асноўным акцыянерам тэрмінала, яму належаць 70 працэнтаў акцый.

«Ніякіх санкцый ЗША для транзіту беларускага калію праз Літву няма і быць не можа, таму што адносна транзіту як працэдуры прымяняць санкцыі нельга», — адзначаецца ў каментарыі Ігара Удавіцкага для агенцтва BNS. Паводле яго слоў, для ўсіх дзяржаў, у тым ліку і для ЗША, абавязковыя міжнародныя дагаворы — пагадненне Сусветнай гандлёвай арганізацыі і Канвенцыя ААН па марскім праве. Яны гарантуюць свабоду транзіту для дзяржаў, якія не маюць выхаду да мора. «Зразумела, што і ЗША, і ЕС, якія ратыфікавалі гэтыя пагадненні, не могуць іх парушаць», — заявіў Ігар Удавіцкі.

Акрамя таго, паводле яго слоў, літоўскі Сейм ратыфікаваў тры двухбаковыя пагадненні паміж Літвой і Беларуссю, якія ўстанаўліваюць свабодны рэжым грузавога транзіту праз Літву і Клайпедскі марскі порт. Паводле слоў Ігара Удавіцкага, усе ўдзельнікі транзіту калійных угнаенняў, у тым ліку органы ўлады Літвы, кансультаваліся і з Дэпартаментам казны ЗША, і з Еўракамісіяй аб прымяненні санкцый. Ім было растлумачана, што беларускі калій можа транспартавацца праз Літву, калі разлікі ажыццяўляюцца ў еўра, а не ў долярах ЗША, сцвярджае прадпрымальнік. «Пры ажыццяўленні такіх аперацый, як продаж беларускага калію, фрахт суднаў, долары ЗША прадаўжаюць выкарыстоўвацца для ўзаемных разлікаў, амерыканскія кампаніі прадаўжаюць купляць беларускі калій, гэты прадукт прадаўжае пастаўляцца на амерыканскі рынак», — заявіў ён.

Упраўленне па кантролі за замежнымі актывамі (OFAC) Дэпартамента казны ЗША выдала даччынаму прадпрыемству «Беларуськалія» — Беларускай калійнай кампаніі (БКК), якая гандлюе ўгнаеннямі, ліцэнзію, сапраўдную да 1 красавіка 2022 года. «Як мінімум да гэтага тэрміну любыя спекуляцыі на тэму амерыканскіх санкцый, што прымяняюцца да транзіту беларускага калію праз Літву, — гэта проста спекуляцыі», — адзначае Ігар Удавіцкі. Аднак, паводле яго слоў, і пасля 1 красавіка, нават калі БКК або «Беларуськалій» не атрымаюць новых ліцэнзій OFAC, гэта ніякім чынам не паўплывае на абавязацельствы Літвы ў адносінах да транзіту беларускага калію.

Сцэнарый скандалу

Літоўскі прэм'ер не змагла адразу растлумачыць, чаму яе дзяржава не выканала волю Вашынгтона. Яна цьмяна заявіла, што з-за некаторых «юрыдычных нюансаў» Літва пакуль не ведае, як у ёй будуць рэалізаваны санкцыі ЗША. «У санкцый ЗША ёсць некаторыя асаблівасці... Яны адрозніваюцца ад звыклых для нас санкцый Еўрасаюза, якія адпавядаюць ведамствам ЕС і накладваюць абмежаванні на кампанію, а не на прадукт. І цяпер ёсць такія юрыдычныя нюансы, якія неабходна спачатку цалкам растлумачыць», — унікліва сказала Шыманітэ.

У сваю чаргу міністр замежных спраў Літвы Габрыэлюс Ландсбергіс заяўляў, што правядзенне ў жыццё санкцый ЗША ў дачыненні да «Беларуськалія» залежыць, маўляў, ад канкрэтных прадпрыемстваў. «Кожны юрыдычны суб'ект, які ўдзельнічае ў ланцужку паставак, павінен вызначыцца: будзе ён заключаць здзелкі ці не? Па сутнасці, правядзенне санкцый у жыццё залежыць ад рашэння самога суб'екта. Прамога юрыдычнага абавязацельства праводзіць у жыццё ўведзеныя ЗША санкцыі не ўзнікае», — сцвярджаў Ландсбергіс.

Паводле яго слоў, мясцовы бізнес, уключаючы дзяржаўныя прадпрыемствы «Літоўскія чыгункі» (ЛЧ) і порт Клайпеды, якія ўдзельнічаюць у транзіце беларускіх угнаенняў, «не абавязаны даваць справаздачу перад дзяржавай за прыняцце рашэнняў». Пры гэтым міністр неаднаразова падкрэсліваў, што ў Літвы ёсць магчымасць «у рамках сваёй кампетэнцыі шукаць выхады — як пачуць запрашэнне стратэгічных партнёраў да салідарнасці».

Аднак, відаць, пасля гэтае запрашэнне заакіянскія гаспадары выказалі, мякка кажучы, больш настойліва. Сябры Камітэта Сейма па замежных справах большасцю галасоў зрабілі адназначную заяву: мы з Амерыкай. І з'явіліся заявы аб звальненні адразу ад двух міністраў. Прэзідэнт Літвы Гітанас Наўседа заўважыў, што рэпутацыі дзяржавы, на яго думку, нанесены вялікі ўрон. «Мы не можам выклікаць ніякіх сумненняў у партнёраў. Дэкларацыі і нашы канкрэтныя дзеянні павінны адпавядаць», — сказаў ён. Тут варта мець на ўвазе пэўнае супрацьстаянне ўрада і прэзідэнта. «Не здзіўлюся, калі сцэнарый скандалу і пісаўся на плошчы Даўканта, 3 — у адміністрацыі прэзідэнта Літвы. Па маёй інфармацыі, каманда Наўседы даўно падтрымлівае сувязі з парламенцкай апазіцыяй, у тым ліку сацыял-дэмакратаў, якія традыцыйна звязаныя з Літоўскімі чыгункамі», — адзначыў vz.ru палітолаг Аляксандр Насовіч. Ён лічыць, што палітычнае жыццё ў Літве становіцца вельмі гарачым.

Мэта кіраўніцтва

Тым часам зноў навіны ад Інгрыды Шыманітэ, настрой якой зменлівы і непастаянны. Стала вядома, што ўрад Літвы працягне работу ў ранейшым складзе, міністры замежных спраў і транспарту Габрыэлюс Ландсбергіс і Марус Скуадзіс павінны застацца на сваіх пасадах, заявіла прэм'ер-міністр. Паводле слоў прэм'ера, яна не задаволіць заявы міністраў аб адстаўцы. «З улікам абвастрэння геапалітычнай сітуацыі, а таксама працягам выклікаў у сувязі з COVID-19 і міграцыяй, было б безадказна рызыкаваць (і стварацьнявызначанасць, якую выклікала б нават спроба фарміравання новай большасці або прыкметнай зменысклады ўрада», — прыведзены словы Шыманітэ ў паведамленні ўрада.

«Цяпер у Сейме не відаць ніякай рэальнай альтэрнатыўнай большасці, якая магла б узяць на сябе лідарства і ініцыятыву і прапанаваць Літве сваю праграму», — сказала прэм'ер-міністр. Яна таксама адзначыла, што цэніць гатоўнасць Ландсбергіса і Скуадзіса ўзяць на сябе адказнасць. «Я не буду прадстаўляць прэзідэнту заявы міністраў аб адстаўцы, і я пераканаю міністраў заявы забраць», — сказала прэм'ер. Міністр замежных спраў Літвы Габрыэлюс Ландсбергіс заявіў, што «ўдзячны прэм'еру за давер» і лічыць, што яна «правільна расставіла акцэнты», паведаміла агенцтва BNS. Адным словам, цырк на дроце, інакш і не скажаш.

А жыхары Вільнюса атрымалі рахункі за ацяпленне за лістапад — многім давядзецца плаціць удвая больш, чым за гэты ж перыяд мінулага года, паведаміў партал Delfi. Такая ж сітуацыя і ў іншых рэгіёнах краіны. Ці ведаюць пра гэта літоўскія ўлады? Мэта кіраўніцтва не ў служэнні Літве і яе нацыянальным інтарэсам, а ў выкананні дырэктыў вышэйстаячых структур калектыўнага Захаду, у першую чаргу ЗША. Пра гэта ў эфіры «Альфа Радыё» заявіў палітолаг Аляксандр Шпакоўскі. «У залежнасці ад узроўню выканальніцкай дысцыпліны і складваецца будучыня кожнага асобна ўзятага літоўскага чыноўніка, — звярнуў увагу эксперт. — Добра сябе зарэкамендуеш — пойдзеш працаваць у Еўракамісію ці яшчэ кудысьці, а не — будзеш сядзець у маленькай сумнай Літве».

Пётр ДУНЬКО.

Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

ЛОТ 1: капитальное строение, инв. № 422/С-40159 (назначение – здание специализированное для производства продуктов питания, включая напитки, и табака, наименование – квасильно-засолочный склад), площадью 302,9 кв. м, расположенное по адресу: г. Щучин, ул. Пионерская, 5А (доля в праве 2/5).

Лот № 1 расположен на земельном участке, кадастровый номер 425850100001000337, площадью 0,0574 га (назначение – для обслуживания квасильно-засолочного склада) по адресу: г. Щучин, ул. Пионерская, 5А (доля в праве 2/5). Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании: земельные участки, расположенные в водоохранных зонах рек и водоемов, код – 2.4, площадью 0,0574 га; земельные участки, расположенные в охранных зонах электрических сетей, код - 5.2, площадью 0,0004 га.
Начальная цена продажи лота – 39 000 руб. (тридцать девять тысяч рублей) с учетом НДС.
Сумма задатка – 3 900 руб. (три тысячи девятьсот рублей)

Продавец – Щучинский филиал Гродненского облastного потребительского общества, 231513, г. Щучин, ул. Пушкина, 26, тел. (801514) 28-1-50

Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 55-87-70, 55-87-71

Условия аукциона – аукцион без условий. Условия оплаты – по договоренности сторон. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 10 рабочих дней с момента подписания протокола аукциона

Номер р/с для перечисления задатка – BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225

Аукцион состоится 18 января 2022 г. в 10.00 по адресу: Гродненская область, г. Щучин, ул. Пушкина, 26

Порядок регистрации в качестве участника аукциона и правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона https://grino.by/aukcion

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 208, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед с 12.30 до 13.18

Последний день приема заявлений – 14 января 2022 г. до 15.00

Телефон для справок: 55-87-71 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» https://grino.by/aukcion

Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

ЛОТ 1: капитальное строение с инвентарным номером 442/С-6237 (назначение – здание специализированное розничной торговли, наименование – здание магазина «Универсам»), общей площадью 351,1 кв. м, расположенное по адресу: г. Островец, ул. Физкультурная, 29А.

Лот № 1 расположен на земельном участке кадастровый № 424655100001001445 5, площадью 0,0578 га (назначение – земельный участок для размещений объектов розничной торговли (обслуживания здания магазина)), расположенном по адресу: г. Островец, ул. Физкультурная, 29А.
Начальная цена продажи лота – 138 000 руб. (сто тридцать восемь тысяч рублей) с учетом НДС.
Сумма задатка – 13 800 руб. (тринадцать тысяч восемьсот рублей)

Условия проведения аукциона – аукцион без условий

Продавец – Островецкий филиал Гродненского областного потребительского общества, 231201, г. Островец, ул. Ленинская, 12, тел. 8-01591-286-72

Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел. 55-87-70

Условия оплаты – по договоренности сторон. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукциона

Номер р/с для перечисления задатка – BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225

Аукцион состоится 28 декабря 2021 г. в 14.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3

Порядок регистрации в качестве участника аукциона и правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона https://grino.by/aukcion

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 212, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед с 12.30 до 13.18

Последний день приема заявлений – 24 декабря 2021 г. до 15.00

Телефон для справок: 55-87-71 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» https://grino.by/aukcion

Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ИЗВЕЩАЕТ О ПОВТОРНОМ АУКЦИОНЕ

ЛОТ 1:
- капитальное строение, инв. № 412/С-13421 (назначение – здание специализированное розничной торговли, наименование – магазин), общей площадью 123,6 кв. м, расположенное по адресу: Мостовский р-н, Песковский с/с, аг. Пески, ул. Заводская, 35/1;
- капитальное строение, инв. № 412/С-13422 (назначение – здание специализированное для производства продуктов питания, включая напитки, и табака, наименование – приемный цех молока), общей площадью 1214,3 кв. м, расположенное по адресу: Мостовский р-н, Песковский с/с, аг. Пески, ул. Заводская, 35;
- капитальное строение, инв. № 412/С-13423 (назначение – сооружение специализированное водохозяйственного назначения, наименование – водонапорная башня), общей площадью 10,1 кв. м, расположенное по адресу: Мостовский р-н, Песковский с/с, аг. Пески, ул. Заводская, 35/2;
- капитальное строение, инв. № 412/С-13424 (назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – склад), общей площадью 90,9 кв. м, расположенное по адресу: Мостовский р-н, Песковский с/с, аг. Пески, ул. Заводская, 35/4;
- капитальное строение, инв. № 412/С-23727 (назначение – здание специализированное энергетики, наименование – трансформаторная подстанция), общей площадью 21,2 кв. м, расположенное по адресу: Мостовский р-н, Песковский с/с, аг. Пески, ул. Заводская, 35/3;
- оборудование: резервуар Я-10В 34025 (2 шт.), артезианская скважина, ограждение, наружные канализационные сети; электроснабжение проходной и наружного освещения молокоприемного пункта «Пески».

Лот № 1 расположен на земельном участке, кадастровый № 424085404101000240, площадью 2,7361 га (назначение – земельный участок для размещения объектов иного назначения (обслуживания строений)), расположенном по адресу: Мостовский р-н, Песковский с/с, аг. Пески, ул. Заводская, 35. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании: земли, находящиеся в прибрежных полосах водных объектов, площадью 2,7361 га.
Начальная цена продажи – 94 112,88 руб. (девяносто четыре тысячи сто двенадцать рублей восемьдесят восемь копеек) с учетом НД.
Сумма задатка – 9 411 руб. (девять тысяч четыреста одиннадцать рублей)

Продавец – Волковысское открытое акционерное общество «Беллакт», 231900, г. Волковыск, ул. Октябрьская, 133, тел. 8-01512-750-25

Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел. 55-87-70

Условия аукциона – аукцион без условий. Условия оплаты – по договоренности сторон. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукциона

Номер р/с для перечисления задатка – BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225

Аукцион состоится 29 декабря 2021 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3

Порядок регистрации в качестве участника аукциона и правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона https://grino.by/aukcion
Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 05.11.2021 г.

Заявления на участие принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 208, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед с 12.30 до 13.18

Последний день приема заявлений – 27 декабря 2021 г. до 15.00

Телефон для справок: 55-87-71 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» https://grino.by/aukcion

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Планар» (продавец) проводит открытый аукцион по продаже

ЗДАНИЯ ЦЕХА ДЕРЕВООБРАБОТКИ

(составные части и принадлежности: пристройка), **общей площадью 1 307,1 кв. м, с инв. № 601/С-27937, расположенного на земельном участке площадью 0,3209 га с кадастровым номером 623288005101000004** *(право постоянного пользования)* **по адресу: Минская область, Логойский район, Янушковичский с/с, д. Жабичи, ул. Метростроевская, 20Г.**

Начальная цена с НДС (20 %) – **176 337,65** бел. руб. (задаток 10 % от начальной цены – **17 633,76** бел. руб.).
Начальная цена снижена на 60 %.

Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Победитель (единственный участник) аукциона оплачивает Организатору аукциона вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 3 (трех) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.rlt.by.**

Предыдущие извещения были опубликованы в газете «Звязда» от 31.07.2021, 14.10.2021, 04.11.2021.

Аукцион состоится **04.01.2022** в **14.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **03.01.2022** до **16.00** по указанному адресу **в каб. 320**.

Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17, 136-31-11. Тел. для осмотра: (8044) 797-93-83.

УНП 100104937

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Озерицкий-Агро» (продавец) проводит открытый аукцион по продаже одним лотом недвижимого имущества в составе:

- **здание телятника с инв. № 614/С-48943 общей площадью 1314,1 кв. м;**
- **здание коровника с инв. № 614/С-48942** *(составные части и принадлежности: 3 (три) пристройки)* **общей площадью 1608,8 кв. м (далее – Объекты).**

Объекты расположены на земельном участке с кадастровым номером 624800000001004920 площадью 3,0322 га *(право постоянного пользования)* **по адресу: Минская область, Смолевичский район, Озерицко-Слободской с/с, в районе д. Аношки.**

Земельный участок имеет ограничения в использовании: охранная зона электрических сетей напряжением до 1000 вольт, пл. 0,0450 га; охранная зона электрических сетей напряжением свыше 1000 вольт, пл. 0,4320 га.

Начальная цена Объектов с НДС (20 %) **– 194 279,80 условных единиц (долларов США)**.

Задаток 10 % от начальной цены (**48 979,00** бел. руб.).

Стоимость Объекта, установленную в долларах США, покупатель оплачивает в белорусских рублях по официальному курсу Национального банка Республики Беларусь на день перечисления денежных средств на счет продавца.

Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, ОКПО 29250255, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней после подписания договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Победитель аукциона (единственный участник аукциона) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов в размере 4 (четырех) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона и возмещает затраты на организацию и проведение аукциона.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.rlt.by.**

Аукцион состоится **18.01.2022** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **17.01.2022** до **16.00** по указанному адресу **в каб. 320.**

Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17, (8029) 136-31-11. Тел. для осмотра: 8 (01776) 28 516, 8(029) 347 22 75.

УНП 690363881

Утерянный договор страхования Балтассистанс серия БА № 1866073 страховой компании ЗАСО «Промтрансинвест» **считать недействительным.**

ЗАО «БелБанкротАукцион»,

организатор торгов по продаже имущества **ОАО «Дятловоремстрой»** (УНП 500056186), объявляет о проведении **27.12.2021 г. в 09.00** публичных торгов в электронной форме на электронной торговой площадке bankrottorg.by

Перечень предметов торгов публично размещен по ссылке: https://bankrottorg.by/wp-content/uploads/2021/12/spisok-imushhestva_dyatlovoremstroj_torgi_27.12.21.pdf

Местонахождение имущества: г. Дятлово, ул. Советская, д. 73.

Ознакомиться с предметом торгов можно в рабочее время, предварительно связавшись с контактным лицом по тел. +375296083100.

Продавец: ОАО «Дятловоремстрой», тел. +375293923903.

Организатор торгов: ЗАО «БелБанкротАукцион», 220015, г. Минск, ул. Гурского, д. 22б, комн. 501; +375296083100; contact@bankrottorg.by.

Для участия в торгах необходимо уплатить задаток в размере **5 %** от начальной стоимости лота не позднее **24.12.2021 г.** на р/с BY16 UNBS 3012 0116 4010 0000 8933, в ЗАО «БСБ Банк», БИК UNBSBY2X, УНП 193417684, получатель – ЗАО «БелБанкротАукцион». Назначение платежа: задаток за участие в торгах по лоту № (номер лота).

Заявления на участие в торгах принимаются с **9.00 16.12.21** по **17.00 24.12.21** на bankrottorg.by.

Перечень документов, прилагаемых к заявлению на участие в торгах:
- свидетельство о государственной регистрации юр. лица (ИП);
- устав юридического лица;
- решение высшего органа управления юридического лица об участии в торгах, о заключении договора купли-продажи предмета публичных торгов в электронной форме, по итогам их проведения;
- для физических лиц: 31, 32, 33 стр. паспорта.

Организатор торгов может отказаться от проведения торгов не позднее чем за пять дней до даты проведения торгов.

Оформление участия в торгах в соответствии с регламентом ЭТП.

Победителем торгов признается лицо, предложившее наивысшую цену за предмет торгов.

Оформление результатов торгов в соответствии с регламентом ЭТП в день проведения торгов.

В случае признания торгов несостоявшимися предмет торгов может быть продан единственному участнику, подавшему заявление на участие в торгах (претендент на покупку), при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Затраты на организацию и проведение публичных торгов в электронной форме составили: стоимость размещения объявления в газете «Звязда» согласно счету-фактуре; аукционный сбор по недвижимости – 2 % от цены реализации предмета торгов; по остальным лотам – 7 % от цены реализации предмета торгов.

Срок подписания договора купли-продажи: в течение пяти рабочих дней со дня проведения аукциона.

Срок и порядок оплаты (условия оплаты): в течение пятнадцати календарных дней со дня проведения аукциона.

ЗАО «ЦЕНТР ПРОМЫШЛЕННОЙ ОЦЕНКИ» сообщает о проведении 29.12.2021 электронных торгов с 9.00 до 16.00 по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Могилевский завод «Строммашина»

Количество лотов	Наименование имущества	Начальная цена продажи без НДС, бел. руб.	Задаток	Шаг аукциона
2	Извещение о проведении электронных торгов и подробные сведения о реализуемых лотах (недвижимость) размещены на сайте **www.bankrot.gov.by** (в разделе «должники», ОАО «Могилевский завод «Строммашина»», «реализация») и электронной торговой площадке **ipmtorgi.by**	Указана на сайте www.bankrot.gov.by	10 %	5 %

Срок подачи заявок на участие в торгах: **28.12.2021 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» (www.ipmtorgi.by).**

Месторасположение имущества: г. Могилев, ул. Первомайская, 77.

Договор купли-продажи покупатель обязан подписать не позднее 10 (десяти) рабочих дней со дня завершения электронных торгов.

Срок оплаты предмета торгов: не позднее 10 рабочих дней со дня проведения торгов.

Список реализуемого имущества и подробная информация о порядке проведения аукциона размещены на сайтах www.bankrot.gov.by и ipmtorgi.by.

УНП 191021390

САМ-НАСАМ З НЕБАМ... І ЗЯМЛЁЙ

СТАГАДОВАЯ ХАТА

Але ж у любой прафесіі ёсць свой час сыходу. І калі Пётр Несцеравіч пайшоў на ваенную пенсію, па чарзе стаў спрабаваць то адзін, то другі занятак, бо сядзець без справы — зусім не пра яго. Неўзабаве адчуў, што трэба вызначыць альбо знайсці нешта значнае, сваё, што прынясе задавальненне ад самой работы, яе вынікаў, і што пазней можна будзе пакінуць унукам. Вырашыў рызыкнуць і паспрабаваць работу на зямлі. «Мусіць, недзе ўнутры альбо на ўзроўні падсвядомасці гены загаварылі, — разважае Пётр. — Мае бацькі ўсё жыццё працавалі на зямлі, як той казаў, усе мы родам з вёскі. Цесць мой, напрыклад, некалі быў галоўным аграномам у калгасе. Ведаў зямлю і разумеў. Ды і агульная тэндэнцыя такая, што людзі пакрысе пацягнуліся з вялікіх гарадоў у сельскую мясцовасць».

Адным словам, склікаў сваю вялікую сям'ю на раду, аб'явіў пра новую ідэю, папрасіў выказвацца на прадмет таго, ці можна будзе чакаць дапамогі. Варта сказаць, што сямейнікі даволі далёкія ад аграрнай сферы. Жонка — выкладчык англійскай мовы, дачка — урач, зяць супрацоўнік МНС, сын — юрыст. Але ўсе падтрымалі мужа і бацьку. Гэта надало яшчэ больш сіл, энергіі. Разважаў па-ваеннаму: задача пастаўлена, трэба яе выконваць. Спачатку шукалі домік у вёсцы, вакол якога можна было б развіваць гаспадарку. Аб'ехалі многія вёскі Жабінкаўскага, Кобрынскага, Брэсцкага раёна. Хацелася, каб гэта была хата на краі паселішча, па сутнасці, хутар. Такую амаль выпадкова знайшлі у Дубічне Маларыцкага раёна. Хата, якой сто гадоў, паказалася асабліва прыдатнай: можа, яна мае добрую энергетыку?.. Яшчэ адзін фактар, што адсюль да яго роднай вёскі Тур Ратнаўскага раёна — нейкія 70 кіламетраў.

І ЯГАДЫ, І САДЖАНЦЫ

Як і многія брастаўчане, Пётр Зварыч родам з Украіны. Адтуль у 1985 годзе пайшоў у армію, з якой звязаў свой лёс. Спачатку служыў далёка ад малой радзімы, потым трапіў у Беларускую ваенную акругу. Да таго часу сястра і брат ужо жылі на Брэстчыне, тут і асеў. Служба, як ужо гаварылася, была звязаная з любімай справай. А пасля службы засталося ўменне заўсёды падтрымліваць добрую форму і жаданне рабіць патрэбную справу.

Адразу пасля пакупкі дома новы гаспадар узяў у арэнду 75 «сотак» зямлі для вядзення асабістай падсобнай гаспадаркі. З першых дзён узяліся за добраўпарадкаванне: прыбралі зараснік, выкарчавалі старыя дрэвы і кустоўе. Пачыналі, можна сказаць, з нуля, у новага гаспадара не было амаль ніякай тэхнікі, за выключэннем старога трактара Т-40. На другі год ужо было пяць гектараў зямлі. Спачатку паспрабаваў вырошчваць клубніцы, але хутка зразумеў, што названая культура вельмі патрабавальная. Ягады яе хутка псуюцца, патрабуюць шмат догляду, перасаджваць яе трэба кожныя два-тры гады.

— Буякамі займацца, як для мяне, больш выгадна і цікава. Пасля першага іх ураджаю падлічылі, што нават для самаакупнасці, а не толькі для далейшага развіцця гаспадаркі, трэба больш зямлі, таму зноў звярнуліся ў мясцовы орган улады з заявай на пашырэнне ўчастка. І цяпер пад фермерскай гаспадаркай значыцца 25 гектараў. Займаюся не толькі ягадамі, але і саджанцамі буякоў, на тэрыторыі разбілі цяпліцы. Паступова зразумеў, што сваю невялікую гаспадарку трэба збалансаваць так, каб максімальна паменшыць рызыкі. Напрыклад, калі ягадай не дабярэш, папоўніць бюджэт можна продажам саджанцаў і наадварот, — разважае фермер-пачатковец.

ВУЧЫЦЦА Ў ЧАС РАБОТЫ

Вучыўся садаводчай справе фермер Зварыч як па інтэрнэце, так і ў стасунках з калегамі. Выязджаў, глядзеў, распытваў. Першыя гады і першыя ўраджаі паказалі правільнасць выбранага кірунку. Сёлета буякі былі нядрэнныя. Тэхналогія захоўваецца, кропельны паліў засцерагае ад засухі, усе кампаненты ўносяцца своечасова. І яшчэ: у гэтай гаспадарцы не баяцца абразаць кусты буякоў. «Некаторыя разважаюць: чым больш галінак пакінуць на расліне, тым больш вырасце ягад. Мы аддаём перавагу якасці — на меншай колькасці галін атрымліваюцца буйныя ягады, яны лепш наліваюцца. Да таго ж гэты ўчастак аказаўся экалагічнай удачай. Буякі тут з пылком, спецыялісты ведаюць, што гэта такое, гэта азначае натуральнае апыленне», — кажа ён.

Сёння ў фермерскай гаспадарцы занятыя пяць чалавек. Трактарыст працуе на пастаяннай аснове, яшчэ ёсць бухгалтар, падсобныя рабочыя. Сам Пётр Несцеравіч таксама шчыруе ў сезон з ранку да вечара: пасадка, праполка, падкормка. Гаворыць, што навучыўся адчуваць расліну, размаўляць з ёй, каб зразумець, чаго ёй не хапае, якія хваробы падступаюць, што трэба ўносіць. Вось толькі прыехаў, адразу абышоў усе плантацыі, агледзеў, адным словам, за пару гадоў работы стаў амаль што аграномам. Так кожны раз: паглядзеў на саджанцы, на сталыя расліны, калі не хапае ведаў, разумення, — пачытаў, параіўся з іншымі фермерамі, спецыялістамі. Вось так прыходзіш да аптымальнага варыянту.

СЯМЕЙНЫ «ДЗІВАКРАЙ»

У выхадныя сюды прыязджае сям'я, найперш каб дапамагчы, ну і яшчэ каб падыхаць свежым паветрам, папрацаваць фізічна, што карысна гарадскім людзям. Гаспадарка «Дзівакрай» — гэта ж сямейная справа. Цікава, што назвай яна абавязана першаму ўнуку Канстанціну. Ён паявіўся на свет, як толькі быў куплены домік і афармлены першы ўчастак зямлі. Нараджэнне новага чалавека ж — заўсёды цуд і здзіўленне. Вось так і нарадзілася гэтае слова за сямейным сталом, слова беларускаўкраінскае, як і сама сям'я.



Стагадовая хата, з якой пачыналася гаспадарка.

Пётр ЗВАРЫЧ.

А сям'я расце, літаральна нядаўна нарадзілася яшчэ двое ўнукаў. Для іх усіх побач са старой хатай узводзіцца новы дом, які абяцае стаць цэнтрам фермерскай гаспадаркі. Цяпер унутры ідуць работы па адстройванні. І хоць яшчэ справы нямала, Пётр Несцеравіч кажа, што на Новы год тут будзе пастаўлена ёлка і ўсе хоць на кароткі час збяруцца разам. Бо ў гэтага маладжавага і энергічнага дзядулі ёсць мара, каб нехта з унукаў з часам прадоўжыў справу.

А пакуль фермер будуе планы на развіццё гаспадаркі. На яго думку, варта ўзвесці цэх па ўпакоўцы прадукцыі, тады будзе больш варыянтаў прапаноўваць яе гандлёвым арганізацыям. Сёлета прадавалі ягады як на сваіх рынках, так і перакупшчыкам з Расіі. Трэба ўлічваць, што пасадкі буякоў растуць, цэны з прычыны канкурэнцыі будуць падаць, а прапанова тавару ва ўпакоўцы ў любым выпадку азначае новы цывілізаваны ўзровень рынкавых зносін.

Калі ўсё будзе добра, можна думаць аб папаўненні тэхнічнага парку. Таксама Пятра Несцеравіча непакоіць кадравае пытанне. На дадзены момант у яго на пастаяннай аснове працуе адзін трактарыст. Спецыяліст, дарэчы, якіх пашукаць. Паводле слоў гаспадара, за справу хварэе, не трэба за ім правяраць альбо лішні раз нагадваць. І калі б удалося знайсці сям'ю такіх жа працаўнікоў, ён гатовы разглядаць пытанне аб будаўніцтве дома для іх на прымальных умовах. Ну а для гэтага, вядома, трэба развіваць гаспадарку.

— Цяпер зіма, мой любімы час, калі мароз, калі ўсё белае, — разважае Пётр Зварыч. — Тут прыгажосць такая — як вокам кінуць. Раней мы раз на год выбіраліся недзе на горныя лыжы. А цяпер гэтага і не трэба, прыроды, як быццам, і тут хапае. Мне падабаецца работа на зямлі, клопат пра расліну. Думаю, што я знайшоў сябе. З жалем гляджу на некаторых саслужыўцаў, якія сябе не знайшлі. Нехта расхварэўся, асобныя наогул сталі ў чарку заглядваць. Ваенны чалавек, ён як: калі зацягнуты, ідзе ў бой, толькі адпусціў партупею, сеў, разгубіўся — стаў сыпацца. І ў гэтым бяда адносна маладых ваенных пенсіянераў. Абавязкова трэба знайсці сваю справу, каб быць у форме і рухацца далей па жыцці. А зямля — яна дае сілы.

Святлана ЯСКЕВІЧ, фота аўтара.

Маларыцкі раён.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Хобі

Кавярня і заасад

Калі захапленне становіцца бізнесам

У заасад Валерыя ЛАНШАКОВА прыходзяць людзі не толькі жывёлін паглядзець, але і паслухаць птушыныя сімфоніі. Жыхары вялікіх гарадоў, якія адпачываюць у санаторыі «Ружанскі», аднойчы вясной зладзілі цэлую экспедыцыю. Бо санаторый у сасновым лесе, там няма такой разнастайнасці пявучага птаства. А гэтае месца крылатыя аблюбавалі даўно і кожную вясну даюць свае раскошныя канцэрты.

Спачатку Валерый Аляксандравіч разглядаў сваю невялікую падсобную гаспадарку выключна як хобі. Ён — даўні аматар жывёл і птушак. На ўласным падворку разводзіў курачак, фазанаў, паўлінаў, індыкоў. Любіў, адным словам, ваддацца з птушкамі. Неяк школьнікі напрасіліся ў госці. А дарослыя сталі пытаць: чаму, маўляў, не арганізоўваеце экскурсіі? Але ж не паказваць людзям дзясятак насельнікаў жывога кутка? Так паступова стала зараджацца ідэя стварэння сапраўднага заасаду.

Валерый Ланшакоў родам аж з Забайкалля. Па адукацыі геолаг. Некалі па камсамольскаму закліку паехаў на БАМ. Там сустрэў свой лёс — Наталлю Яўгенаўну. Пасля развалу Саюза прынялі рашэнне пераязджаць на радзіму жонкі. Так аказаліся ў Ружанах. Маюць невялікі бізнес — прадуктовую краму. А калі паўстала пытанне, у якім кірунку развівацца, адказ нібыта быў на паверхні — уладкоўваць заасад як турыстычны аб'ект. На аўкцыёне купілі будынак былой школы ў вёсцы Малочкі, што зусім побач з Ружанамі. У ваколіцы пабудавалі вальеры. Цяпер тут жывуць яноты, лісы, іншыя драпежнікі, алені, лані, самае рознае птаства. Вавёркі карцінна грызуць арэшкі за сеткай, алені паслухмяна, нібы сабакі, бягуць на покліч гаспадара. Адразу кідаецца ў вочы, што жывёлы дагледжаныя, поўсць аж бліскучыць.

Былую школу ўжо адрамантавалі, тут неўзабаве адкрыецца кавярня для турыстаў, будзе некалькі гасцінічных нумароў, каб людзі маглі адпачыць на прыродзе.

Вядома, заасад — справа нятанная. Кожнага звера трэба зарэгістраваць ва ўстаноўленым законам парадку. Пастаянна

Валерый ЛАНШАКОЎ.

бываюць праверкі. Ды і на ўтрыманне патрэбна шмат сродкаў. Паводле слоў гаспадара, адным толькі драпежнікам мяса на месяц трэба больш чым на сто долараў, а яшчэ збожжа, кукуруза, агародніна, прэпараты для прафілактыкі хвароб... Але ж Валерый Ланшакоў аднойчы вырашыў, што рызыкнуць варта, асабліва калі ты займаешся любімай справай.

Святлана ЯСКЕВІЧ, фота аўтара.

Пружанскі раён.

Кніжны гасцінец

ПУШЧА НЕ МАЕ СТОЛІ І СЦЕН



Казімір Камейша. Астравы на сушы. Аповесць, лірычныя запісы і мініяцюры, эсэ. Мінск, выдавецтва «Беларусь», 2021.

«Магчыма, не кожнаму густу даганджу гэтымі сваімі згадкамі. Ды не засмучу нязгодных, калі скажу, што пісалася гэта так, як і былі рассыпаны на сушы самі астравы-хутары. А іх пад шнурок не падгоніш. Тут будзе заўсёды крыху хаатычна, крыху асіметрычна, аднак жа з прыкідам свайго жыццёвага вокамеру, з думай не толькі пра сябе, але і нашчадкаў сваіх». Такую прадмову даў да аповесці «Астравы» Казімір Камейша. Нездарма ён называе сябе «пушчанскім чалавекам» — вырас на дзедавым хутары ў Стаўбцоўскім раёне, каля Нёмна і Сулы. Аповесць — панарама беларускага жыцця, пачынаючы ад таго, як працавіты хлопец Казюк, уладкаваўшыся аканомам да пана, здолеў абзавесціся гаспадаркай, стварыць уласны лясны востраў, на якім гадаваліся пакаленні роду... Не ў апошнюю чаргу таму, што дзіўнаваты мясцовы граф Брэза праз нешчаслівае каханне разарыўся і распрадаў свае ўладанні: *«Нехта бачыў, а можа, прыдумаў, як ехаў урэшце граф Брэза на худзеньк ім коніку праз Рубяжэвічы, пацягваў нешта гадкае з мутнай бутэлькі ды горка ўздыхаў: — Эх, бутэлечка! Такое вузенькае рыльца, а прайшло праз цябе ўсё: і лес, і поле, і доля мая... І ўсё прапала... І яго не вернеш...»*

«Хутар вырастаў з лесу, хутар і сам некалі быў лесам». Магчыма, так мог выглядаць лёс сям'і з коласаўскай «Новай зямлі», калі б Міхал не памёр, а набыў усё-ткі надзел. Нават Віленскі зямельны банк, у які ездзіў дзядзька Антось з «Новай зямлі», тут таксама фігуруе... Дружная работа, патрыярхальны лад жыцця.

Але час няўмольны. Мяняюцца ўлады... Казюк і ягоная сям'я назіраюць, як у 1939-м *«начамі, прыхапіўшы сёетое з залатога скарбу, беглі праз пушчу ашаломленыя паны і падпанкі». Потым — вайна, блакада Налібоцкай пушчы: «Усё вакол грымела, і, падагрэтае ярасным летнім сонцам, палала, як тое пекла. Карнікі з батальёна Дэрлінвангера нішчылі на сваім шляху ўсё жывое»*. Потым — пачатак калгасаў, што для хутаранцаў дужа балюча... Ды яшчэ страх перад бандамі «лясных братоў», ад якіх таксама давялося пацярпець. Усё зведала простая беларуская сялянская сям'я. Трагедыі, несправядлівасці, поспехі — малы ўнук Казюка, у якім пазнаецца аўтар, стаў пісьменнікам і вяртаецца ў любыя сэрцу мясціны. *«Дзе хаты? Дзе людзі? Дзе дрэвы, дарогі і сцяжыны, па якіх яны хадзілі і ездзілі? Няма. Усё знікла і растала ў сумнай смузе часу»*.

У кнігу таксама ўвайшлі мініяцюры з цікавага цыкла «Паміж кубкам і вуснамі», а таксама эсэ пра вядомых літаратараў, з якімі сутыкаў аўтара лёс.

Джэром Сэлінджэр. Столь падымайце, цесляры. Сімар. Уводны курс. Выдавецтва «ЭКСМО», Масква, 2021.



Пра Сэлінджэра, які, дасягнуўшы славы, схаваўся ад свету ў бункеры, ходзіць шмат чутак... А вядомы ён найперш як аўтар культавага рамана «Лавец у жыце». Але раман гэты — адна з дзевяці частак цыкла пра сям'ю Гласаў. Падзеі аповесцяў «Столь падымайце, цесляры» (у іншым перакладзе гэта гучыць як «Вышэй кроквы, цесляры») і «Сімар» — адбываюцца раней, чым у згаданым рамане. Сёння зноў надзвычай папулярны вобраз генія-сацыяпата з высакародна самотнай душой, якога катэгарычна не разумее асяроддзе прафанаў. Гласы — менавіта такія... Сямёра дзяцей сям'і комікаў калісьці ўдзельнічалі ў радыёшоу для вундэркіндаў, іх любіла ўся Амерыка — і ненавідзела, бо надта разумныя. Вундэркінды падраслі, і цяпер адзін з іх, Бадзі Глас, едзе з арміі на вяселле свайго брата Сімара. Сімар, паэт і філосаф, закахаўся ў дзяўчыну з простага мяшчанскага кола. «Яна спрабавала навучыць мяне ўсміхацца і расцягвала мне вусны пальцамі». Для гэтага асяроддзя ён — неўраўнаважаны дзівак, якога трэба адправіць да псіхааналітыка. Ім не растлумачыш, чаму сястра Сімара напісала змылкам на люстэрку ў ваннай словы, якія сталі назвай аповесці. А гэта — пачатак верша антычнай паэткі Сапфо, эпіталама: «Вышэй столь, цесляры! Уваходзіць жаніх, падобны Арэю, вышэй усіх высокіх мужоў». Сваякам нявесты ўвогуле бескарысна што-небудзь тлумачыць, паколькі жаніх спазніўся на вяселле, і пра яго цяпер толькі менцяць злыя язык і.... А Бадзі змушаны гэта выслухоўваць, бо апынуўся з імі ў адной машыне, ды яшчэ давялося запрашаць грамаду дахаты.

Два светы супастаўляюцца і супрацьпастаўляюцца... Паміж імі прорва, якую можа запоўніць толькі духоўная праца, якая звонку выглядае марнаваннем часу. *«Перш за ўсё, існуе адна даволі жудасная рыса, уласцівая ўсім богашукальнікам — яны часам шукаюць Творцу ў самых неўяўляльных і непадыходзячых месцах: напрыклад, у радыёрэкламе, у газетах, у сапсаваным лічыльніку таксі — словам, літаральна абы-дзе, але як быццам заўсёды з найлепшым поспехам»*.

Не магу сказаць, што ўсім будзе даспадобы твор, насычаны алюзіямі, з прысмакам дзэн-будызму і псіхадэлікі... Але кімсьці застанецца запатрабаваны заўсёды.

Выданні для агляду прадстаўленыя кніжнай крамай «Акадэмічная кніга», Мінск, пр-т Незалежнасці, 72.

Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	9.23	16.47	7.24
Віцебск —	9.20	16.29	7.09
Магілёў —	9.13	16.37	7.24
Гомель —	9.01	16.43	7.42
Гродна —	9.37	17.04	7.27
Брэст —	9.29	17.14	7.45

Месяц

Першая квадра
11 снежня.
Месяц у сузор'і Цяльца.

Імяніны

Пр. *Андрэя, Георгія, Івана, Мікалая, Савы, Сафрона, Фёдара.*
К. *Аліцыі, Альбіны, Яўсея.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЗАЎТРА



Даты Падзеі Людзі

16 СНЕЖНЯ

У краіне

1876 год — нарадзіўся Яўген Уладзіміравіч Клумаў (падпольны псеўданім Самарын), удзельнік Мінскага антыфашысцкага падполля ў гады Вялікай Айчыннай вайны, Герой Савецкага Саюза, кандыдат медыцынскіх навук, прафесар.

У Вялікую Айчынную вайну з восені 1941 года працаваў у першай гарадской бальніцы: дапамагаў параненым падпольшчыкам і партызанам, забяспечваў падполле і многія партызанскія атрады медыкаментамі і хірургічным інструментам, цалкам абсталяваў два партызанскія шпіталі. У кастрычніку 1943-га арыштаваны гітлераўцамі, адмовіўся з імі супрацоўнічаць і разам з жонкай у 1944-м закатаваны нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У Мінску яго імем названы вуліца і 3-я клінічная бальніца, на будынку якой устаноўлена мемарыяльная дошка.

1901 год — нарадзіўся Іван Ціханавіч Грышын, савецкі военачальнік, генерал-палкоўнік, удзельнік вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў у гады Вялікай Айчыннай вайны, Герой Савецкага Саюза. Ваяваў на Заходнім, Бранскім, 2-м Беларускім франтах: камандзір стралковай дывізіі, начальнік штаба арміі, з чэрвеня 1943-га — камандуючы арміяй. Удзельнік Смаленскай, Усходне-Прускай і Беларускай аперацый. Армія пад яго камандаваннем вызначылася ў баях за вызваленне Магілёва, пры фарсіраванні Дняпра, Друці і Бярэзіны, удзельнічала ў ліквідацыі мінскага «катла».

У свеце

1866 год — нарадзіўся Васіль Васільевіч Кандзінскі, рускі жывапісец і графік, адзін з заснавальнікаў і тэарэтыкаў абстрактнага мастацтва. Удзельнічаў у арганізацыі таварыства «Сіні вершнік».

1946 год — нарадзіўся Бені Андэрсан, шведскі кампазітар, музыкант, музычны прадзюсар, аранжыроўшчык і спявак. Найбольш вядомы як удзельнік групы ABBA.

1966 год — XXI сесія Генеральнай Асамблеі ААН ухваліла Міжнародны пакт аб грамадзянскіх і палітычных правах (уступіў у сілу 23 сакавіка 1976-га).

1971 год — XXVI сесія Генеральнай Асамблеі ААН адобрыла Дэкларацыю аб абвяшчэнні Індыйскага акіяна зонай міру.

1991 год — у Рызе падпісана Дэкларацыя аб прынцыпах добрасуседскіх адносін паміж Рэспублікай Беларусь і Латвійскай Рэспублікай.

Так гаварыў...

ЧАРЛІ ЧАПЛІН:

«Жыццё без спрэчак было б вельмі сумным. Усё, што жыве, патрабуе абмеркавання».

УСМІХНЕМСЯ

— Хачу такую работу, як у Дзеда Мароза! Суткі праз 364...

— Дзяўчаткі, а Дзед Мароз, аказваецца, прагны!

— З чаго ты ўзяла?

— А ён замест таго, каб мне свой падарунак прынесці, знайшоў ляльку, якую мама ў шафе хавала, і пад ялінку паклаў.

Ад невыканання тэхнікі бяспекі чалавек можа не толькі памерці, але і нарадзіцца.

Ідуць два радавыя ў арміі, адзін кажа:

— Слухай, давай з прапара пажартуем!

— Хопіць! Ужо з дэкана пажартавалі!

У мяне суседзі — псіхі. Ноч, амаль дзве гадзіны, стукаюць у столь і па батарэях. Добра яшчэ, што я ў гэты час не сплю, а на баяне іграю.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

прыём рэкламы тэл./факс: 311 17 27,

e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by

(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, праспект Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 14.804. Індэкс 63850. Зак. № 3222.

Нумар падпісаны ў 19.30

15 снежня 2021 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12